Пролетары усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

№ 5 (3413) Панядзелак, 6 студзеня 1930 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63.
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619,78 кантора—1.

Тав. Антонаў-Аўсеенка—паўнамоцны прадстаўнік у Польшчы

МАСКВА. Прэзыдыум ЦВК СССР вызваліў Антонава-Аўсеенку ад абавязкаў паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Літве і назначыў яго паўнамоцным прадстаўніком СССР у Польшчы.

Апошнія навіны Б. С. С. Р.

Наркамасьветы заключыў умову з Белжыпсаюзам і Гандальбудам на пабудову 10 будынкаў. У Менску мяркуецца пабудаваць быдынак для дашкольнага тэхнікуму ў 15.000 куб. мэтраў. Будзе пабудавана агульнае памяшканьне для камвузаўцаў, галоўны корпус для папітэхнікуму

Бальшавіцкім тэмпам

«Цэнтральнай праблемай, якая стаіць сёньня з асаблівай сілай перад КП(б)Б, зьяўляецца праблема кадраў». Такую ацэнку даў праблеме кадраў верасьнёўскі пленум ЦК КП(б)Б у сваёй адозьве да партыі. Выточным становішчам, якое вызначае правільнасьць такой пастаноўкі праблемы аб кадрах у Савецкай Беларусі, зьяўляецца тое, што тыя гіганцкія задачы, якія стаяць перад намі ў галіне індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі сельскае гаспадаркі, мы ня зможам вырашыць, калі абмяжуемся налічным складам кіраўнічых кадраў. Трэба палепшыць якасьць нашых кіраўнічых кадраў, патрэбны новыя тысячы кіраўнікоў сацыялістычным будаўніцтвам на ўсіх яго вучастках. Пры вырашэньні пытаньня аб кіраўнічых кадрах нам трэба ўлічыць, што патрэбны кадры, якія ўмеюць стаяць на чале мас, [illegible]даваць іх наступленьнем на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, што ўмеюць ва ўмовах абвостраных клясавай барацьбы цьвёрда, пабальшавіцку праводзіць выразную клясавую лінію, ажыцьцяўляць на практыцы генэральную лінію партыі і здольны кіраваць сацыялістычнай рэканструкцыяй прамысловасьці і сельскае гаспадаркі. Трэба таксама ўлічыць, што нам патрэбны кадры, якія ўмеюць ажыцьцяўляць лінію партыі ва ўмовах нацыянальнай рэспублікі з яе складаным нацыянальным пераплётам, якія ўмеюць праводзіць выразную ленінскую лінію ў нацыянальным пытаньні.

Мабілізацыя ўсёй партыі на барацьбу з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, зруйнавальны адпор правым, дробна-буржуазным капітулянтам, рашучая барацьба з правым апартунізмам як у зорыі, гэтак і ў практычнай рабоце, прывялі да яшчэ большага згуртаваньня камуністычных радоў, выклікалі вялізарны ўздым і згуртаваньне шырокіх рабочых, батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх мас вакол асноўнай ленінскай лініі нашай партыі. Апартуністычная, няленінская ўстаноўка правых ухілістых, не разумеючых усёй важнасьці і вострасьці праблемы кадраў і замазваючых задачу фарсыраванай падрыхтоўкі новых кадраў пралетарскіх спэцыялістых, выцякае проста з апартуністычнай тэорыі правых і іх установкі на згортваньне тэмпу індустрыялізацыі і калектывізацыі. Вынікі першага году пяцігодкі пацьвердзілі правільнасьць генэральнай лініі партыі на максымальна шпаркі тэмп індустрыялізацыі і калектывізацыі і адгэтуль высоўваецца на першы плян актуальнейшая праблема падрыхтоўкі новых кіруючых пралетарскіх кадраў.

Савецкая Беларусь, у выніку Кастрычніка рэвалюцыі, як неразрыўная частка ўсяго Савецкага Саюзу, пры актыўнай дапамозе з боку ўсіх савецкіх рэспублік, пад кіраўніцтвам кампартыі, вышла на шырокі шлях эканамічнага і культурнага росквіту, ужо выхавала мясцовыя пралетарскія кадры, што забясьпечвае рэальную магчымасьць ажыцьцяўленьня верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б аб замене той часткі кіруючых кадраў, якая нездольна ў складаных умовах рэканструкцыйнага пэрыяду і абвостранай клясавай барацьбы ажыцьцяўляць бальшавіцкую лінію партыі, яшчэ ня ізжыўшых традыцыі розных дробна-буржуазных партый (Грамады, Бунда і інш.) і абнаруживаючых на цяжкіх этапах сацыялістычнага будаўніцтва апартуністычныя і нацыянал - дэмакратычныя хістаньні, ажыцьцявіць рашучы курс на вылучэньне новых пралетарскіх кадраў з всяродзьдзя перадавой, ідэалёгічна ўстойлівай часткі рабочае клясы ўсіх нацыянальнасьцяй.

Аналіз складу кіраўнічых кадраў сьведчыць аб вялікіх дасягненьнях нашай партыі ў галіне ўзмацненьня пралетарскага і камуністычнага ядра, павышэньня марксыцка-ленінскай падрыхтоўкі і згуртаваньня нашых кадраў. Побач з гэтым трэба прызнаць, што пралетарскае ядро на радзе вучасткаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца зусім нездавальняючым. Перад намі стаіць важнейшая задача па далейшым арабочаньні складу кіраўнічых кадраў нашага дзяржаўнага і капэрацыйнага апарату. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на значнае ўзмацненьне ў бліжэйшы-ж час кадраў для калектывізацыі сельскай гаспадаркі, а так сама кадраў тых арганізацый, якія працуюць на культурным фронце БССР. Гаворачы аб кіраўнічых кадрах, трэба рашуча падкрэсьліць, што ў складзе кіраўнічых кадраў зусім нездавальняючая колькасьць жанчын, рабстніц. З агідным адносінамі да вылучэньня работніц, батрачак на практычную работу трэба пакончыць. Пленум павінен устанавіць ліміты, выкананьне якіх павінна быць абавязковым на працягу бліжэйшага часу.

Для рашучага паляпшэньня налічнага складу кіраўнічых кадраў і здавальненьня ўзросшай патрэбнасьці сацыялістычнага будаўніцтва на кіраўнічыя кадры, трэба вылучыць на адказную работу тысячы «найбольш стойкіх, бальшавіцкі праверваных, палітычна падрыхтаваных камуністых рабочых, батракоў» непасрэдна з вытворчасьці. Акрамя таго, трэба арганізаваць сыстэматычнае прасоўваньне на больш адказную работу тых рабочых, якія ўжо раней былі вылучаны на нізавую работу. Мы асабліва падкрэсьліваем неабходнасьць максымальнае ўвагі вылучэньню батракоў, рабочых саўгасаў, беднякоў. Сярод іх ёсьць шмат сіл, іх трэба знайсьці. Было-б няправільна, калі-б мы сказалі, што нездавальняючы сацыяльны склад часткі кіраўнічых кадраў у некаторых арганізацыях зьяўляецца вынікам няўважлівасьці да гэтага пытаньня з боку партыі. Мы маем вялікі паток рабочых з вытворчай на кіраўнічую работу. Але справа ў тым, што тэмп вылучэньня невыстарчальны і што ён павінен быць значна ўзмоцнены. Побач з паляпшэньнем сацыяльнага складу нашых кадраў трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на паляпшэньне нацыянальнага складу кіраўнічых кадраў у тых арганізацыях, дзе процант пралетараў-беларусоў яўна нездавальняючы. Мы адкідаем паклёп аб тым, што партыя зварачала невыстарчальную ўвагу на гэтае пытаньне.

Да гэтага часу ўся работа ў галіне падбору кіраўнічых кадраў, павышэньня узроўню іх палітычных і тэхнічных ведаў і кваліфікацыі была ўскладзена амаль цалкам на парторганы. З гэтым трэба пакончыць. Адказнасьць за стан кадраў у кожнай арганізацыі, у кожнай установе павінна быць ускладзена на кіраўнікоў гэтых арганізацый і ўстаноў. Трэба палепшыць падлік і вывучэньне кадраў па лініі ўсіх арганізацый, падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў павінна быць таксама ўскладзена на гэтыя арганізацыі. Разгорнутае рабочае шэфства прадпрыемстваў над асобнымі ўстановамі і арганізацыямі, цесная сувязь дзяржапарату з рабочымі масамі даюць рэальную магчымасьць гэтым установам і арганізацыям узмацніць падбор кадраў. Вылучэньне і падрыхтоўка выпучэнцаў таксама павінна быць рашуча палепшана. Вялікія пэрспэктывы адкрываюцца перад намі ў галіне падрыхтоўкі рабочых на кіраўнічую работу ў сувязі з арганізацыяй рабочых брыгад для вывучэньня асобных частак дзяржаўных, капэрацыйных і іншых устаноў і арганізацый, побач з гэтым трэба арганізаваць падрыхтоўку вылучэнцаў на спэцыяльных курсах. Аднэй з важнейшых задач у галіне паляпшэньня скарыстаньня кадраў зьяўляецца замацаваньне работнікаў на больш доўгі тэрмін на аднэй і тэй-жа рабоце. Зусім зразумела, што кіраўніцтва партыі падборам і падрыхтоўкай кіраўнічых кадраў павінна быць яшчэ больш узмоцнена. Таксама павінна быць рашуча ўзмоцнена справа ўзьняцьця ўзроўню марксыцка-ленінскіх ведаў.

Пад знакам ваяўнічага бязбожжа

У рэдакцыю газэты кожны дзень паступаюць рэзалюцыі агульных сходаў рабочых, членаў калгасаў, беднякоў і сераднякоў, якія патрабуюць ад савецкіх органаў закрыць цэрквы, перадаць іх будынкі пад культурныя ўстановы, а званы — на карысьць індустрыялізацыі.

На чыгунцы праведзены сходы, якія аднагалосна патрабуюць ад гарсавету выкананьня наказу пры леташніх выбарах у гарсавет аб закрыцьці чыгуначнай царквы.

Каляды (25 сьнежня) рабочыя сустракалі каля варштатаў, на клюбных вечарох.

Дзень індустрыялізацыі даў сотню тысяч рублёў у фонд індустрыялізацыі краіны.

Пагалоўны выхад на работу — найбольш красамоўны адказ рабочых мас на рэлігійныя сьвяты.

Гэты масавы, арганізаваны выклік рэлігіі нарадаіў вельмі сумныя настроі ў клерыкалаў. Апошнія ў дні 25-26 Наступаюць каляды па старым стылі. Папы напэўна зробяць усё магчымае, каб згуртаваць свае рады, каб дабіцца рэваншу.

Прафэсыянальныя арганізацыі, саюз ваяўнічых бязбожнікаў не павінны адпачываць на лаўрах, супакойвацца дасягненьнямі 2-га дня індустрыялізацыі.

Трэба разгарнуць шырокую антырэлігійную работу, дабіцца, каб у дзень каляд па старым стылі ня было ніводнага прагулу, каб усе рабочыя фабрык, заводаў, саўгасаў, як адзін чалавек, зьявіліся на работу.

Савецкія органы павінны сур'ёзна падыйсьці да запатрабаваньняў рабочых аб закрыцьці цэркваў і зьняцьці званоў.

Менскі гарсавет павінен, нарэшце, задаволіць патрабаваньне чыгуначнікаў аб закрыцьці чыгуначнай царквы.

Цэнтральнай камісіі па аддзяленьні царквы ад дзяржавы трэба ажывіць сваю работу.

М.

Падрыхтоўка да веснавое сяўбы на Украіне

ХАРКАЎ, 4. З розных округ Украіны паступаюць весткі аб энэргічнай падрыхтоўцы да веснавое пасеўнае кампаніі. Шаўчэнкаўская округа праводзіць падрыхтоўку да веснавое пасеўнае кампаніі пад лёзунгамі суцэльнае калектывізацыі. З Зіноўеўскае округі падаюць, што ў бягучую веснавую пасеўную кампанію ў калгасы будзе ўцягнута на менш 60 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і 7.000 батракоў. Пралетарыят Зіноўеўшчыны пасылае на сяло да веснавое пасеўнае кампаніі 240 рабочых. З Мікалаеўскае округі падаюць, што падрыхтоўка да веснавое сяўбы ўжо пачалася. Гэтаю вясною будзе працаваць 1.200 трактараў, 72.540 коняй і 740 валоў.

Адначасова з гэтым ужо ў сучасны момант выяўляецца налічча сур'ёзных непаладкаў. У Мікалаеўскай акрузе для трактараў патрэбна 100.000 шт. розных запасных часьцей. Мясцовая мікалаеўская прэса ўжо б'е трывогу і патрабуе ад адпаведных арганізацый прымусіць Мэталятрэст і завод імя Марты дапамагчы сельсаюзу ў правядзеньні рамонту трактароў. З Жытоміра пішуць, што на Валыні актыўнай работы па правядзеньні веснавое пасеўнае кампаніі не наглядаецца. Справа абмяжоўваецца паперовай перапіскай паміж адпаведнымі арганізацыямі. (ТАСС).

„У СССР будуецца новы, лепшы сьвет"

ЗАЯВА БУРЖУАЗНАГА ВУЧОНАГА АБ СССР

БЭРЛІН, 3. Вядомы нямецкі вучоны Адольф Грабоўскі апублікаваў у газэце «Франкфуртэр Цэйтунг» артыкул, прысьвечаны сацыялістычнаму будаўніцтву ў СССР.

Гэты артыкул сваёй аб'ектыўнасьцю адрозьніваецца ад паклёпніцкіх вымыслаў буржуазнага і сацыял-дэмакратычнага друку, які стараецца дыскрэдытаваць вялізарную работу па сацыялістычным будаўніцтве ў СССР і ставіць пад сумненьне магчымасьць ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну. У сваім артыкуле Грабоўскі заўважае, што «у Савецкім Саюзе будуецца новы, лепшы [illegible] сьледчыкамі і падарожнікамі, якія жадаюць вывучыць становішча ў краі, адкрыты ўсе шляхі. Асабліва вялікае ўражаньне на Грабоўскага зрабіла разьвіцьцё «калектыўнага самаўсьведамленьня мас», якое выяўляецца ва таксама вялізарная работа на разьняволеньні жанчыны. Грабоўскі быў таксама вельмі зьдзіўлены тым, што «ў СССР грошы ўжо адыгралі сваю ролю сацыяльнага барометру».

Падагульваючы вынікі сваіх уражаньняў аб СССР, Грабоўскі піша: «Там (у СССР) вырашаюцца вялікія для чала- [illegible]

Не галавацяпства, а злачынства

52.000 коняй забіта ў БССР за 3 месяцы

КАЛГАСЫ АДЧУВАЮЦЬ НЕДАХОП У ЦЯГАВАЙ СІЛЕ, А ЖЫВЁЛАГАДОЎЧАЯ КААПЭРАЦЫЯ І КАЛГАССАЮЗЫ САДЗЕЙНІЧАЮЦЬ ЗНІШЧЭНЬНЮ КОНСКАГА СКЛАДУ

Разбазарваньне жывёлы--на руку кулаку. Сыгналы „ЗЬВЯЗДЫ" ня былі пачуты

Аб чым пісала „Зьвязда"

23-га сьнежня мінулага году «Зьвязда», паведамляючы аб абураючых і нячуваных справах, якія адбываюцца на рынку коняй, сыгналізавала аб пагражаючых нам вялізарных небясьпеках. «Зьвязда» пісала:

«Кожны дзень нашы газэты пішуць аб неабходнасьці зараз-жа спыніць разбазарваньне і зьнішчэньне жывёлы. Мы б'ем трывогу, што на гэта важнейшае пытаньне да гэтага часу яшчэ не зварачаецца належная ўвага на мясцох, у раёнах і акругах.

Вось факты.

Менская кантора скурсындыкату купляе коняй для скур. Асобныя беднякі і сераднякі, пад уплывам кулацкай агітацыі аб уступленьні ў калгас бяз сродкаў вытворчасьці, прадаюць на забой коняй, якія цалкам могуць быць годны для калгасаў і саўгасаў.

Здаецца, што ў захаваньні моцнай маладой скаціны для калгасаў і саўгасаў павінны быць зацікаўлены ў першую чаргу Калгассаюз і Наркамзем.

Але на справе выходзіць, што гэтыя ўстановы, замест таго, каб дапамагчы спыніць зьнішчэньне патрэбчай жывёлы, самі дапамагаюць гэтаму зьнішчэньню.

Некаторы час таму назад Скурсындыкат скупіў на рынку звыш 100 коняй, сярод якіх было шмат маладых, якія па вельмі таннай цане змаглі-б быць перададены калгасам. Скурсындыкат паведаміў аб гэтым Наркамзему і Калгассаюзу і папрасіў прысылаць прадстаўніка, каб адабраць коняй, якія могуць быць годны для калгасаў і саўгасаў.

Але дарэмна. Ніхто ні з Наркамзему, ні з Калгассаюзу не зьявіўся.

Гэтымі днямі таксама былі куплены на забой 4 маладыя здаровыя жарабцы. Скурсындыкат зноў зьвярнуўся ў Наркамзем з просьбай забраць іх для накіраваньня ў калгасы.

Але ніхто не зьявіўся.

Кожны раз інспэктар Наркамзему абяцае прыехаць, але вельмі хутка забывае пра свае абяцанкі, коні стаяць па некалькі дзён і потым іх прыходзіцца забіваць для скуры.

Калі такое становішча мы наглядаем у Менску, у самым цэнтры, то можна сабе ўявіць, што робіцца на мясцох.

Трэба, каб калгассаюзы, малочна-жывёлагадоўчыя саюзы трымалі моцную сувязь з загатоўчымі арганізацыямі. Нельга дапусьціць, каб коні, якія могуць быць скарыстаны ў калгасах, забіваліся для скуры».

На жаль, адпаведныя ўстановы і арганізацыі не палічылі патрэбным своячасова рэагаваць на прыведзеныя намі факты і тэрмінова прыняць належныя меры да спыненьня масавага забою коняй. Коні зьнішчаюцца і зараз.

Нячуваныя разьмеры забою коняй

Сёньня «Зьвязда» мае магчымасьць прывесьці рад абураючых даных, якія даводзяць, што забой коняй за апошнія месяцы набыў нячуваныя разьмеры ў БССР.

Як паведамляе Беларуская кантора Скурсындыкату, толькі **за першы квартал бягучага гаспадарчага году па БССР было забіта 52 тыс. коняй, з якіх у сьнежні—35 тысяч.**

На запытаньне, можа гэта ўся колькасьць коняй ужо не магла быць скарыстана на працы ў сельскай гаспадарцы і на транспарце—загадчык Беларускай канторы Скурсындыкату адказаў, што:

30 проц. забітых коняй былі годны для працы, 10 проц. забітых складае маладняк ад 6 да 8 месяцаў.

„Разьлікі" і сапраўднасьць

Тут к месцу будзе прывесьці наступныя меркаваньні Калгассаюзу БССР адносна забесьпячэньня беларускіх калгасаў цягавай сілай. Па думцы гэтай арганізацыі выходзіць, што сёлета беларускія калгасы выкінуць на рынак непатрэбныя ім каля 55 тысяч коняй, якія, нібыта, нават зьяўляюцца абузай для калгасаў. Пры гэтым Калгассаюз выходзіць з наступных даных: для апрацоўкі кожных 100 гэкт. індывідуальнай ворнай зямлі патрэбна 18 з пал. коняй, для кожных-жа 100 гэкт. калектыўнай зямлі—толькі 11 з пал. коняй. Прымаючы пад увагу шпаркі тэмп калектывізацыі ў БССР, Калгассаюз і лічыць, што нерацыянальна трымаць цэлых 85 тысяч лішніх коняй, калі калгасы могуць в посьпехам абыйсьціся і бяз іх. Акрамя таго, Калгассаюз лічыць, што згортваньне кулацкіх і заможных гаспадарак дасьць таксама рынку каля 65 тысяч коняй і, такім чынам, **у бягучым гаспадарчым годзе на рынак будзе выкінута 150 тысяч коняй.** У 1929 г. у БССР налічвалася ўсяго 1.090.000 коняй.

Што рабіць з гэтымі каньмі, калі нават лічыць, што лічбы зусім гравільныя?

Па думцы Калгассаюзу, амаль ніякага іншага выхаду, як забіваць гэтых «лішніх» коняй, няма.

Такія разьлікі Калгассаюзу. Якая-ж сапраўднасьць?

Калгассаюз, сьцьвярджаючы, што ў калгасах ёсьць шмат лішніх коняй, глыбока памыляецца. Аб гэтым яскравa сьведчаць заявы, зробленыя на апошнім пленуме ЦК КП(б)Б аб тым, што ў радзе калгасаў ёсьць толькі па 1-2 кані і што неабходна прыняць тэрміновыя меры да забесьпячэньня гэтых калгасаў цягавай сілай.

Роля НКЗ і жывёлагадоўчай каапэрацыі

Такога-ж пункту погляду, як і Калгассаюз, прытрымліваюцца і работнікі НКЗ, якія загаднаюць гэтай справай. Найлепшым доказам правільнасьці гэтага зьяўляецца поўнае ігнараваньне тых агідных спраў, што адбываюцца на рынку коняй, з боку інспэктара НКЗ па коньнях. І гэты, як паведамляла «Зьвязда» яшчэ 23 сьнежня, нё зварачаў ніякай увагі на патрабаваньні Скурсындыкату адбіраць маладых і годных да працы коняй.

Згодна паведамленьня Скурсындыкату, скупляй коняй займаецца таксама малочна-жывёлагадоўчы саюз і спажывецкая каапэрацыя. На ролі малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі варта спыніцца асобна. Мы ўжо адзначалі яе ролю ў куплі для калгасаў малочнай жывёлы па непамерна павышаных цэнах. Зараз мы маем яшчэ адзін довад таго, што малочна-жывёлагадоўчая каапэрацыя не займаецца тэй асноўнай справай, якая ляжыць на яе абавязку ў пэрыяд разгорнутага тэмпу сацыялістычнай рэканструкцыі нашай сельскай гаспадаркі. І сапраўды, замест таго, каб імкнуцца забясьпечваць сацыялістычны сэктар цягавай сілай, яна ігнаруе тое становішча, якое стварылася на рынку коняй, не адбірае лепшых коняй для калгасаў і саўгасаў, а дазваляе іх бяскарна зьнішчаць. Так, наша малочна-жывёлагадоўчая каапэрацыя выконвае сваю задачу разьвіцьця жывёлагадоўлі ў БССР.

У сьвятле такіх фактаў, паводзіны калгассаюзаў і малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі, вярней іх садзейнасьць масаваму зьнішчэньню коняй і асабліва конскага маладняка, зьяўляюцца злачынствам. Адзначаныя намі адносіны НКЗ, малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі і калгассаюзаў да масавага зьнішчэньня коняй зьяўляюцца нічым іншым, як грубым парушэньнем партыйных дырэктыў.

Напомнім заяву т. Якаўлева

Тут к месцу будзе прывесьці вытрымку з прамовы наркома зямляробства СССР т. Якаўлева, якая была ім зроблена гэтымі днямі ў Маскве:

— Прыяжджаюць.—кажа тав. Якаўлеў,—таварышы ў Маскву і заяўляюць: «У нас суцэльная калектывізацыя». А на пытаньне: «Як у вас расцэньваецца конь на сялянскім рынку?» адказваюць: «Ад 5-ці да 10 рублёў». Аб чым гавораць такія факты? Яны гавораць аб тым, што многія яўсім ня ўлічваюць таго, што цягне за сабой разбазарваньне сялянскіх коняй. Тых сялян, якія перад тым, як уступіць у калгас, распрадаюць сваіх коняй, трэба разглядаць, як жадаючых падарваць працу калгасу. Трактар заўтра павінен перавярнуць нашу гаспадарку. Сіла трактара павінна поўнасьцю замяніць сілу сялянскай канякі. Але на гэта патрэбен рад гадоў. Пашыраць плошчу гэтай вясной у асноўным пакуль што яшчэ прыдзецца пры дапамозе калектывізаванага сялянскага інвэнтару.

Перад працаўнікамі калгасаў і машынатрактарных станцый зараз асноўнай задачай зьяўляецца скарыстаньне сялянскага каня і простага сялянскага інвэнтару так, каб іх вытворчая магутнасьць здолела забясьпечыць павышэньне ўраджайнасьці нашых палёў.

Яшчэ адно злачынства

Побач з такім злачынствам, як масавы забой коняй, наглядаецца і другое злачынства. Справа ідзе аб рацыянальным скарыстоўваньні конскага мяса, касьцей і інш. адкідаў. І аб гэтым пісала «Зьвязда» 23-га сьнежня. Зноў дамо вытрымку:

«Яшчэ адзін цікавы факт, які характарызуе бюракратычнасьць і нядбайнасьць некаторых нашых устаноў.

Мяса-каніна зьяўляецца найлепшым кормам для сьвіней. Зараз, калі мы ставім дзесяткі тысяч сьвіней на адкорм, гэтае мяса забітых коняй магло-б быць скарыстана, як найлепшы корм. Некалькі раз Скурсындыкат зварачаўся ў ЦРК і інш. установы, каб забіралі гэтае мяса, але ніхто не адгукнуўся.

Мяса коняй прыходзіцца закопваць у зямлю і яшчэ плаціць за гэта грошы ў той час, калі выкарыстоўваньне гэтага мяса для адкорму з'эканоміла-б дзяржаве дзесяткі тысяч пудоў каштоўных кармоў. Так, за лістапад было забіта каля 1.500 коняй (па Менску) і ўсё мяса было закапана на конскіх могілках замест таго, каб пайсьці на адкорм сьвіней».

Закопваньне конскага мяса і касьцей, гэтага каштоўнага экспартнага прадукту, працягваецца ў радзе месц БССР і зараз. Пратэстуючы супроць гэтага, мы хочам сказаць, што мяса і косьці тых коняй, якія забіваюцца і павінны быць забіты, а прычыны іх непрыгодзнасьці ні для сельскай гаспадаркі, ні для транспарту, таксама не скарыстоўваюцца. **У зямлю закопваюцца сотні тысяч рублёў. Зьнішчаецца вялізарная колькасьць добрага бялковага корму ў той час як мы адчуваем вялізарны недахват у канцэнтраваных кармох.**

Нам здаецца, што прыведзеных нячуваных абураючых фактаў хопіць, каб урэшце зьвярнуць належную ўвагу на пытаньне жывёлагадоўлі ў БССР. Даволі гутарак і спрэчак. Трэба прыняць рашучыя і тэрміновыя меры. Трэба расьсьледаваць апісаную намі абураючую справу і зрабіць з яе належныя вывады.

Кулак вядзе шалёную агітацыю за разбазарваньне жывёлы. Кулак усімі сіламі прабуе аслабіць сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі.

Садзейнасьць пагібелі конскага складу, аб якім мы пішам вышэй, аб'ектыўна на руку кулаку.

ВЭН.

АБ „МЕСЯЧНІКУ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ" ЗАБЫЛІ

Па Савецкім Саюзе пачаўся «месячнік жывёлагадоўлі», але ў БССР аб ім нават яшчэ і ня думаюць.

Гэты факт зноў сьцьвярджае, што ў нас яшчэ не зразумелі таго вялізарнага значэньня, якое адыгрывае ў БССР жывёлагадоўля і што да вырашэньня праблемы хутчэйшага стварэньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі зацікаўленыя ўстановы і арганізацыі адносяцца ў лепшым выпадку нядбайна.

Між тым, у нас наглядаюцца недапушчальныя зьявішчы разбазарваньня жывёлы, кармоў; слаба ідзе ўнямплектаваньне калгаснага стада малочнай жывёлай, моцна зьнішчаецца конскі маладняк і г. д.

Усё гэта гаворыць аб тым, што трэба, нарэшце, зрабіць пералом у адносінах да жывёлагадоўлі. Трэба прыцягнуць усю ўвагу як зацікаўленых арганізацый, а таксама і савецкай грамадзкасьці да балючых пытаньняў у гэтай галіне.

Адным з лепшых сродкаў у гэтым напрамку павінен зьявіцца «месячнік жывёлагадоўлі». Яго трэба неадкладна арганізаваць у БССР.

АДОЗВА РАБОЧЫХ СОРМАУЦАЎ

Рабочым, работніцам, бяднейшаму і серадняцкаму сялянству БССР

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Мы, дэлегаты, пасланыя ў Беларусь воляю рабочае канфэрэнцыі, ад імя 21.000 рабочых, работніц заводу Краснае Сормава, шлем вам палкае пралетарскае прывітаньне. Мы, сормавічы, металістыя, пралетары агню і жалеза, рапартуем вам, што кантрольныя лічбы, вызначаныя першым годам пяцігодкі ў 48 млн. руб., намі выкананы з посьпехам. Выконваючы рашэньні генэральнае лініі партыі, мы ўзялі на сябе абавязацельства ў другім годзе пяцігодкі, вызначыць і выканаць праграму не ў 48 млн., а ў 74 млн. руб. Гэта павялічэньне па кантрольных лічбах патрабуе ад рабочае клясы і ад усіх заводзкіх арганізацый надзвычайнае напружанасьці, сьвядомасьці і ўзмацненьня барацьбы за працоўную дысцыпліну, мы бярэм на сябе абавязацельства ў другім годзе пяцігодкі зьнізіць сабекошт на 14 проц. і ўзьняць прадукцыйнасьць працы на 30 проц., і на гэта мы далі пралетарскае абяцаньне рабочым заводаў Калёмны і Іжэўску; мы рэканструюем наш завод, будуем новыя цэхі. Няма сумненьня, што такія тэмпы сямутаму не па гусьце, але такім элемэнтам сьвядомы рабочы павінен даваць адпор у штодзённай працы, рашуча змагаючыся з прагуламі і нядбайствам ў вытворчасьці.

Дарагія таварышы! Знаёмячыся з вашай работай, з вашай барацьбой на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, мы пераканаліся, што вы таксама маеце вялізныя дасягненьні, нячуваны тэмп пабудовы новых фабрык і заводаў, пашырэньня заводаў, павялічэньня пралетарскага ядра ў Беларусі. Гэтыя дасягненьні ўзмацняюць фундамант пабудовы сацыялізму ў нашым краі. Побач з дасягненьнямі мы і вы маем рад труднасьцяй, але гэтыя труднасьці пры нашай згуртаванасьці перамагаюцца і будуць пераможаны. Мы ўпэўнены ў тым, што пралетарыят Беларусі не абмяжуецца гэтымі дасягненьнямі, а яшчэ вышэй падыме сьцяг сацыялістычнае будоўлі на аснове генэральнай лініі партыі, узмоцніць пільнасьць у барацьбе з клясавым ворагам, які прабуе сарваць пасьпяховасьць сацыялістычнага накапленьня першай у сьвеце Савецкай Рэспублікі. І яшчэ больш трэба ўзмацніць агонь на барацьбу з права-апартуністычнымі ўхіламі і дробна-буржуазнымі настроямі, ныцікамі і малаверамі ў сілы рабочае клясы, якія капітулююць перад усякімі труднасьцямі.

Мы, дэлегаты, бачылі, якая вялізная праца праведена партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі ў галіне перабудовы сельскае гаспадаркі, у галіне разьвіцьця калгаснага ру- [illegible] і серадняцкае сялянства сьвядома пераходзяць ад індывідуальнае гаспадаркі на больш буйное калектыўнае землякарыстаньне, на сацыялістычныя рэйкі. Гэта пацьвярджаюць лічбы, як факт—Магілёўская акруга калектывізавана на 48 проц. Не адстаюць і іншыя акругі. Рабочая кляса Беларусі, у прыватнасьці гор. Менску, павінна безадкладна стаць на чале гэтага сьвядомага парыву бедняка і серадняка, павінна практычна яшчэ больш дапамагчы ім, трэба зараз-жа рабочай клясе вытрымаць са свайго асяродзішча клясава вытрыманых пралетараў. Сормавічы ў сваю чаргу пасылаюць на першы раз 100 таварышоў, якія з упэўненасьцю апраўдаюць давер'е рабочых пашага заводу і ім павінна быць аказана падтрыманьне з боку рабочых Беларусі. Мы, дэлегаты, бярэм на сябе абавязак, як прыедзем у Сормава, паставіць пытаньне перад рабочымі аб узяцьці шэфства над аднэй з акруг Беларусі і гэтым дабіцца ў падшэфнай акрузе суцэльнае калектывізацыі і давядом, што мы не на паперы, а на справе ўмеем выконваць рашэньні нашае партыі.

Таварышы рабочыя, работніцы заводаў «Бальшавік», «Энэргія», «Камунар» і фабрыкі Меншвэй, партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі гораду Менску! Мы, дэлегаты, выказваем вам падзяку за ваш шчыры таварыскі прыём. Вы патаварыску аднесьліся да нас, калі мы вас наведвалі і знаёміліся з вашай работай, аб гэтым мы раскажам нашым рабо- [illegible] уперад, да хутчэйшай пабудовы сацыялізму ў нашым краі, пад кіраўніцтвам кампартыі і яе ленінскага ЦК УсеКП(б)!

Дэлегаты сормавічы:
М. Каракін, Малафееў,
Ф. Аладзьін, В. Белаусаў.

Дэлегацыя сормаўскіх рабочых у сэкратара ЦК КП(б)Б тав. ГЭЯ

Маскоўскія навіны

УСТАНАВІЦЬ ЦЬВЁРДУЮ НАВУЧАЛЬНУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ

Старшыня Галоўпрафобру т. Вышынскі ў лісьце да рэктароў ВНУ катэгарычна патрабуе ажыць другагодніцтва сярод студэнтаў. Застаўленьне на другі акадэмічны год дазваляецца ў кожным асобным выпадку толькі з дазволу Галоўпрафобру. Аналёгічную меру правёў «Главтуз» у адносінах ВНУ, падпарадкаваных ВСНГ. За 4 спазьненьні без паважных прычын студэнты будуць выключаны.

ШЫРАКСКІ СТЭП ДАСЬЦЬ 500.000 ТОН НАФТЫ

Старшыня «Саюзнафты» т. Ломаў паведаміў нам, што ў бліжэйшы час у раёне нафтавых месцанараджэньняў Шыракскага стэпу пачынаюцца шырокія работы па здабываньні нафты. У Шыракскі стэп накіроўваюцца ударныя группы інжынэраў і рабочых. К канцу [illegible] Шыракскі стэп будзе шта- [illegible]

ДУХ БРАНЯНОСЦА „ПАЦЕМКІНА" ЖЫВЕ СЯРОД ФРАНЦУСКІХ МАРАКОЎ

Праўда аб паўстаньні на французскім крэйсэры „Вальдэк Русо"

НЬЮ-ЁРК, 1. У кастрычніку 1929 г. амаль ва ўсёй сусьветнай прэсе было зьмешчана паведамленьне, што на французскім браняносцы «Вальдэк Русо» (водазьмяшчэньне 14 тыс. тон), які плаваў у кітайскіх водах, недалёка Амоя, выбухла рэвалюцыйнае паўстаньне матросаў. Яно было задушана пры дапамозе амэрыканскага крэйсэра «Пітсбург», выкліканага па радыё капітанам «Вальдэк Русо». Аб усім, што адбылося на мяцежным браняносцы, амаль нічога ў друку не адзначалася, бо вайсковыя міністэрствы ПАЗШ і Францыі ахінулі гэта ваяраньне дымавою заслонаю маўчаньня.

Толькі ў апошнія дні сталі вядомы некаторыя факты, якія праліваюць яскравае сьвятло на трагэдыю, каторая адбылася на борце мяцежнага судна. Гэтымі днямі ў ПАЗШ вярнуліся матросы амэрыканскага крэйсэра «Пітсбург», якія паведамілі некаторыя падрабязнасьці задушэньня паўстаньня.

Амэрыканскія маракі расказваюць, што ў паўстаньні прымала ўдзел большая часьць экіпажу «Вальдэк Русо». Каманды складзі судна, баючыся паўтарэньня падзей на браняносцы «Пацёмкін», забарыкадаваўся ў радыё-станцыі і, не перастаючы, кідаў ў эфір заклікі аб дапамозе. Хутка на дапамогу падасьпеў амэрыканскі крэйсэр «Пітсбург», які «супакоіў» паўстаўшых, пагразіўшы затапіць судно. Рулі амэрыканскіх гармат прымусілі рэвалюцыйных маракоў капітуляваць. Яны не адчувалі сябе досыць моцнымі, каб даць бой перавышаючаму па магутнасьці крэйсэру «Пітсбург» (водазьмяшчэньне 15.400 тон).

Зараз-жа пасьля адачы пачалася расправа над паўстаўшымі. Быў назначаны надзвычайны вайсковы суд, які прыгаварыў двух кіраўнікоў паўстаньня **да пакараньня сьмерцю праз павешаньне.** Прысуд быў выкананы на вачох у каманды французкага і амэрыканскага крэйсэраў. **«Мяцежнікі» былі павешаны на борце «Вальдэк Русо».**

Пасьля гэтага ўсе ўдзельнік

Капіталістычны сьвет у ціскох супярэчнасьцяй

Пад гэтым загалоўкам быў надрукаваны ў апошніх нумарох «Правды» (№№ 3 і 4) артыкул т. **Мануільскага.**

Спачатку т. **Мануільскі** спыняецца на вострым біржавым крызісе ў ПАЗШ. Гэты крызіс зьяўляецца пачаткам агульнага эканамічнага крызісу ў ПАЗШ. Ня гледзячы на ўвесь шум, аб «росквіце» краю, гэты крызіс не зьяўляецца, аднак, нечаканым. Аб надыходзячым крызісе пісаў ужо два гады таму назад нават буржуазны ангельскі эканамісты Пэйш у ангельскім Гардыян».

Пачынаючы з другой паловы 1929 г. крывая сусьветнай эканамічнай кан'юнктуры пачынае **паўзьці ўніз.** Надыходзіць сусьветны эканамічны крызіс. Аб гэтым гаворыць цэлы рад фактаў. Ужо ўся ўсходняя частка Эўропы, якая мяжуецца з СССР, ахоплена агульным эканамічным крызісам: Аўстрыя, Вэнгрыя, Польшча, Балканы, Прыбальтыка. Якія-ж будуць непасрэдныя вынікі эканамічнага крызісу?

1) Зрыў капіталістычнай стабілізацыі, абвастрэньне ўсіх супярэчнасьцяй капіталізму, паскарэньне тэмпаў паляваньня рабочае клясы, рост яе нездаваленьня, што ідзе побач з ростам нездаваленьня дробнай буржуазіі, якая руйнуецца. У шырокіх масах працоўных будзе страчана вера ва устойлівасьць капіталістычнай сыстэмы; адбудзецца звужэньне базісу рэфармізму, страта рабочай арыстакратыяй яе ўдзельнае вагі ў рабочым руху.

2. Рэзкае скарачэньне ўнутранога рынку ,узмацненьне дыспрапорцыі паміж вытворчым апаратам капіталістычнае гаспадаркі і магчымасьцямі збыту. Скарачэньне вытворчасьці цягне за сабою ўжо зараз узмацненьне масавага беспрацоўя. Бакханалія абагачэньня асобных граф буржуазіі на фоне масавага зьбядненьня паглыбіць бяздоньне паміж сацыяльнымі полюсамі.

3. Надавычайнае ўзмацненьне амэрыкана-эўрапэйскай барацьбы з прычыны імкненьня Злучаных Штатаў выйсьці з крызісу за кошт Эўропы, а таксама ўзмацненьне барацьбы паміж капіталістычнымі дзяржавамі і на эўрапэйскім кантынэнце. Барацьба за рынкі набудзе больш вострую форму ў сувязі з імкненьнем ПАЗШ дабіцца посьпеху ў гэтай галіне, пазбавіўшы Эўропу доўгатэрміновых крэдытаў, якія ўзмацняюць пазыцыі эўрапэйскага капіталізму. Агрэсыўнасьць палітыкі ПАЗШ узмоцніцца з-за імкненьня забраць у Эўропы крыніцы сырцу. Гэта ня можа ня выклікаць узмацненьня супярэчнасьцяй, якія падраджаюць плянам Юнга, росту барацьбы за калёніі, за Кітай у першую чаргу. У той-жа час узмоцніцца націск на эканамічна слабыя краіны. Абвострыцца няўхільна небясьпека імпэрыялістычных войн, павялічацца спробы імпэрыялістычных дзяржаў прарваць рамкі манаполіі замежнага гандлю ў СССР.

4. Крызіс можа прагучэць пахавальным звонам для міжнароднай сацыял-дэмакратыі і міжнароднага рэфармізму, ужыўшы якіх у рабочым руху быў дасьнейшым чынам зьвязаны з капіталістычнай стабілізацыяй. Крах гэтай стабілізацыі падарве кароньні міжнародны сацыял-дэмакратыі, можа закончыць тое, чаго не зрабілі ў поўнай меры сусьветная вайна і Кастрычніцкая рэвалюцыя ў сэнсе ліквідацыі ўплыву сацыял-дэмакратыі па рабочую клясу.

Крызіс можа стаць ракавым для капіталістычнага грамадзтва. Яго вынікі ва ўмовах напружанасьці капіталістычных супярэчнасьцяй могуць быць няменшымі, чым вынікі сусьветнай вайны 1914-18 г. Высьпяваньне рэвалюцыйнай сытуацыі ў радзе краін можа вельмі хутка пайсьці ўперад.

Гэты крызіс разьбівае ўсе тэорыі правых апартуністых аб «арганізаваным капіталізьме» і г. д.

1929 год быў годам цяжкога **аграрнага крызісу** ў капіталістычных краінах. Гэты крызіс выявіўся ў скачкох цэн на с.-г. прадукты. Даволі сказаць, што за апошнія 8-9 месяцаў цэны 3-4 разы падніміліся і падалі ўніз.

Індывідуальная сялянская гаспадарка ня ў стане вытрымаць гэтых скачкоў цэн на с.-г. прадукты. Таму ня дзіва, што ва ўсіх капіталістычных краінах ідзе працэс зруйнаваньня дробнае гаспадаркі.

Адначасова ў капіталістычных краінах ідзе тэхнічная рэканструкцыя, мэханізацыя сельскае гаспадаркі. Трактары, камбайны, машыны, электрычнасьць, наогул індустрыялізацыя сельскае гаспадаркі зрабілі ў радзе капіталістычных краін вялікія посьпехі. Але ўсе гэтыя паляпшэньні ідуць на карысьць толькі буйным памешчыцкім і кулацкім гаспадаркам, аслабляючы канкурэнцыйную здольнасьць дробных сялянскіх «свабодных» па тэрміналёгіі «Нэйе Цюрыхе Цэйтунг» гаспадарак. Сярадняцкія і асабліва бядняцкія гаспадаркі адначасова руйнуюцца пад ударамі канкурэнцыі, якая абвастраецца з боку буйных гаспадарак. **Тэхнічны прагрэс ідзе побач з гіганцкімі сацыяльнымі няшчасьцямі для дробнай і значнай часткі сярэдняга сялянства.** А ва ўмовах сучаснага капіталізму цяжка знайсьці выхад з гэтага тупіку.

Частка сярэдняга сялянства і мільёны беднякоў руйнуюцца, паўпэрызуюцца, у той-жа час рацыяналізацыя прамысловасьці, вялізная налічная армія беспрацоўных у гарадох, замаруджаньне тэмпу росту прамысловага пралетарыяту — усё гэта да крайнасьці затрудніе для зруйнаваных сялян магчымасьць знайсьці працу ў прамысловасьці ў якасьці пралетараў.

Вось важнейшыя адзнакі **дэградацыі сельскае гаспадаркі** ў капіталістычным сьвеце.

А ў СССР пралетарская рэвалюцыя адкрыла новы, нячуваны ў гісторыі чалавецтва шлях і для сялянскай гаспадаркі.

Тав. Мануільскі далей гаворыць аб зрыве пляну Юнга. За апошні час супярэчнасьці паміж Паўночна-Амэрыканскімі Злучанымі Штатамі і Англіяй надзвыча абвастрыліся. Гэтыя супярэчнасьці можна зараз намацаць на ўсіх кантынэнтах земнае кулі амаль пальцамі. Гэта ёсьць **рашаючая супярэчнасьць у капіталістычным лягеры.** Яе не замазаць ніякімі «згодамі» па пытаньнях ваенна-морскіх узбраеньняў.

Зрыў ангельска-амэрыканскай згоды няўхільны, бо капіталізм ня ў стане перамагчы анархіі, якая яго разьдзірае, ня адольны зьнішчыць ні войнаў, ні патрасаючых капіталістычнае грамадзтва эканамічных крызісаў.

С.

Па Савецкім Саюзе

ЗА ДВА ТЫДНІ—БОЛЬШ ЯК ЗА ГОД

Двухтыднёвік калектывізацыі, які надаўна скончыўся ў Валоўскім раёне, даў вялікія вынікі. Замест 33 калгасаў зараз у раёне ўжо 58. **Удзельная вага калгасаў у пахаці паднялася з 12 да 38 процантаў.** Дасягненьні за два тыдні перакрываюць посьпехі калектывізацыі раёну за ўсе ранейшыя гады.

КАЛГАС ІМЯ СТАЛІНА

За апошнія дні арганізаваўся рад калгасаў, якія названы імем тав. Сталіна. У **Клянотках,** Тульскай акрузе, **арганізаваўся Сталінскі калгас,** які аб'ядноўвае 520 сялянскіх гаспадарак.

11 НОВЫХ АГАРОДНЫХ КАЛГАСАЎ

«Мосовощесоюз» арганізаваў рад агародных калгасаў у Маскоўскай акрузе. У Сонечнагорскім раёне такіх калгасаў арганізавана 2, столькі-ж у Сяргееўскім, у Васкрасенскім—4 і ў Клінскім—3.

У ЛІХАСЛАЎЛЬСКІМ РАЁНЕ

У Ліхаслаўльскім раёне суцэльнае калектывізацыі шпарка расьце колькасьць новых калгасаў. **Пасёлак Чорная Ніва цалкам запісаўся ў калгас,** у паселішчы Селязеніха арганізавалася арцель у 15 двароў, у вёсцы Некрасіха аб'ядналася ў калгас 20 двароў. Вёска Лісьі Горы з таварыства па сумесным апрацоўцы зямлі рэарганізавана ў арцель. Усяго **ў калгасы** ў Ліхаслаўльскім раёне да 15-га сьнежня **уступіла каля 35 проц. усіх сялянскіх гаспадарак.**

ПЕРАВАЛІЛА ЗА 50 ПРОЦАНТАЎ

У Кашырскім раёне, Сярпухоўскай акругі, і Кураўскім, Арэхава-Зуеўскай акругі, у калгасы ўцягнута палова ўсіх сялянскіх гаспадарак, а ў **Зьвенігародзкім раёне, Маскоўскай акругі,—52 процанты.**

У АЎТАНОМНАЙ МАЛДАЎСКАЙ ССР

МАСКВА. У аўтаномнай Малдаўскай ССР падрыхтоўка да веснавое сяўбы вядзецца здавальняюча. Ёсьць усе падставы меркаваць, што вясной бягучага году ўдасца аграмадзіць усю рабочую жывёлу і прылады. У аўтаномнай Малдаўскай ССР да веснавое пасеўнае кампаніі будуць арганізаваны 592 калгасы, пры чым тры раёны будуць цалкам калектывізаваны. (ТАСС).

40 камуністак— на работу ў калгасы

Менскі АК КП(б)Б накіроўвае для работы ў калгасы 40 камуністак. Мабілізаваныя таварышы пройдуць трохдзённыя курсы, пасьля чаго безадкладна будуць накіраваны ў калгасы.

Партыйнае будаўніцтва

Пабальшавіцку стаць на чале паходу за калектывізацыю

Партыйныя арганізацыі,

мабілізуйце рабочую і бядняцка-сярэдняцкую грамадзкасьць наўкола баявых задач веснавой пасеўнай кампаніі

Важнейшая задача партарганізацый

Год вялікага пералому на ўсіх вучастках нашага сацыялістычнага будаўніцтва ўнёс у справу правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі рад тых асаблівасьцяй, якіх мы ня мелі ва ўсе папярэднія гады сваёй работы і будаўніцтва. Шпаркі тэмп індустрыялізацыі краіны, творчы энтузіязм пралетарскіх мас, імкненьне бядняцка-сярэдняцкіх пластоў вёскі да калектывізацыі — усё гэта вымагае ад партыі надаць выключна важнае значэньне пасеўнай кампаніі; паставіць перад усімі партарганізацыямі, ячэйкамі і асобнымі камуністымі задачы, каб яны ў практычнай рабоце, як мага з большым посьпехам, з максымальнай паўнатой выканалі тыя асноўныя ліміты, якія намечаны для правядзеньня ў веснавую сяўбу.

Гэта адказьнейшая і сур'ёзьнейшая работа па правядзеньні веснавой сяўбы ня можа быць з посьпехам праведзена, калі партыйныя ячэйкі калгасаў, саўгасаў, вёсак і прадпрыемстваў у горадзе не паставяць у цэнтр увагі сваёй работы тых пытаньняў, якія непасрэдна зьвязаны з правядзеньнем пасеўнай кампаніі. Мабілізаваць увагу партыйнаў, камсамольцаў, рабочых, батракоў і беднаты вакол задач партыі па пасеўнай кампаніі, канкрэтна падыйсьці да вызначэньня, абмеркаваньня і ажыцьцяўленьня плянаў — вось чым сёньня павінны заняцца парт'ячэйкі як вёскі, так і гораду.

Сёлетняя пасеўная кампанія адбываецца ў той час, калі ў горадзе і на вёсцы ідзе клясавая барацьба, калі вёска перажывае вялікі пералом, руйнуе капіталістычны ўклад гаспадараньня. Калгасны рух набывае магутны характар, ломіць супраціўленьне кулака, пракладвае шырокі шлях для сацыялістычнага будаўніцтва.

А ў надыходзячую вясну гэтыя размахі, якія з кожным днём усё пашыраюцца, набудуць яшчэ больш грандыёзныя разьмеры. І для таго, каб іх ахапіць партыйна-пралетарскім кіраўніцтвам, каб калгасны рух накіраваць па правільным рэчышчы, якое вызначыла партыя, кожная ячэйка і кожны асобны камуністы павінны ўзяць сапраўды баявыя тэмпы, узьняць якасьць сваёй практычнай работы. Партарганізацыі павінны мабілізаваць гатоўнасьць шырокіх партыйных мас для барацьбы за яшчэ большыя тэмпы работы па калектывізацыі, адначасова павесьці жорсткую барацьбу з тымі асобнымі выпадкамі, калі некаторыя камуністыя плятуцца ў хвасьце калектывізацыі, з тымі пасьўнымі адносінамі парт'ячэек да калектывізацыі, якія яшчэ маюць месца ў некаторых арганізацыях. Парт'ячэйкі не павінны прайсьці міма ні аднаго факту абыякавых адносін камуністых да таго руху сялянскай беднаты да калектывізацыі, які наглядаецца ў кожнай акрузе, у кожным раёне.

Згуртаваўшы вакол сябе батрацтва і беднату, партарганізацыі павінны ўзмоцніць сваё наступленьне на фронце выкарчоўваньня карэньняў капіталізму ў вёсцы. павінны быць гатовы ў любую хвіліну даць рашучы адпор кулаку, які імкнецца сарваць мерапрыемствы партыі па сацыялістычнай перабудове вёскі, партарганізацыі павінны рашуча змагацца з усякімі ўхіламі, асабліва з правым, ад генэральнай лініі партыі.

Рад калектыўных гаспадарак, якія за зіму арганізаваліся, толькі ўступаюць у строй сацыялістычнай сыстэмы. Яны яшчэ арганізацыйна і гаспадарча слабыя. Таму іх трэба акружыць максымальнай увагай і клопатамі, усімі мерамі і сродкамі дапамагчы ўмацавацца і пільна сачыць за тым, каб у іх не пралізьлі кулацкія элемэнты і каб пралезшыя часамі ў іх сацыяльна-варожыя элемэнты не маглі разбурыць гэтых калектываў з сярэдзіны.

Парт'ячэйкі павінны ў даным выпадку правяць вялікую празорлівасьць і пільнасьць, памятаючы аб тым, што яны адказваюць перад партыяй за становішча гэтых сацыялістычных гаспадарак.

Асабліва зараз з надыходам веснавой пасеўнай кампаніі, а таксама і ў часе яе практычнага правядзеньня трэба асноўную ўвагу накіраваць на замацаваньне саўгасаў, калгасаў, на арганізацыю новых калгасаў, ахапіць імі як мага шырэйшыя бядняцкія і сярэдняцкія гаспадаркі вёскі.

Умацаваньне калгасаў, саўгасаў, арганізацыя новых, пашырэньне пасеўнай плошчы выкліча часовы недахват с.-г. машын і прылад, угнаеньня і г. д. Перад партарганізацыямі павінна быць з усёй вострасьцю пастаўлена задача, як мага паўнейшай нагрузкі і выкарыстаньня з найбольшым эфэктам тых машын і прылад, якія ёсьць у наяўнасьці.

Пытаньні насенных фондаў, добраякаснасьці і ачысткі насеньня ў барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці адыгрываюць рашаючае значэньне. Таму гэтыя пытаньні павінны стаць, як адны з асноўных у веснавой сяўбе. Барацьба з разбазарваньнем, скормліваньнем насеньня скацінай у кулацкіх гаспадарках, поўнае скарыстаньне машын па ачыстцы збожжа і г. д. — баявая задача дня.

Нарэшце, ячэйкі павінны зараз-жа канкрэтна прыступіць да такой важнейшай задачы, як ліквідацыя агранаяўсьменнасьці як сярод партыйна-камсамольскіх мас, так і бядняцка-батрацкіх пластоў вёскі.

Тое значэньне, якое надае партыя правядзеньню пасеўнай кампаніі, патрабуе, каб парт'ячэйкі паставілі заража на ногі ўсе грамадзкія і савецкія арганізацыі, каб усю работу бліжэйшых месяцаў падначалілі задачам правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі.

А. К.

СЫГНАЛІЗУЕМ

Ня гледзячы на выразныя дырэктывы Менскага АК КП(б)Б, асобныя раёны партарганізацыі Меншчыны яшчэ ня прымаюць канкрэтнага ўдзелу ў практычнай падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі. Праведзена толькі агульная работа па абмеркаваньні плянаў веснавой сяўбы ў кожным раёне Менскай акругі. Большасьць вясковых арганізацый Меншчыны ўжо абмеркавала пляны веснавой пасеўнай кампаніі на раённых сходах і сходах партыйных ячэек. Пленум Плешчаніцкага раённага камітэту партыі, які адбыўся ў канцы сьнежня, ухваліў рад канкрэтных мерапрыемстваў па разгортваньні калектывізацыі ў раёне. Пленум даў жорсткія дырэктывы ячэйкам па ўзмацненьні існуючых калгасаў і арганізацыі новых камун і калектываў. Паводле пастановы пленуму, Плешчаніцкі раён абвешчаны раёнам суцэльнай калектывізацыі. Але трэба адзначыць, што ў раёне яшчэ нядаўна калектывізацыя была слаба разгорнута. Толькі за апошні час на гэтым вучастку заўважваецца відавочны і рашучы пералом. Зараз у Плешчаніцкім раёне калектывізавана 20 проц. усіх гаспадарак раёну. Рад іншых раённых камітэтаў партыі таксама ўхваліў практычныя мерапрыемствы па ўзмацненьні калгаснага будаўніцтва і падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі. Але, падкрэсьліваем, яшчэ няма ніякіх вестак аб ажыцьцяўленьні гэтых мерапрыемстваў. Але яшчэ няма глыбокага пералому ў падрыхтоўчай рабоце раённых партыйных арганізацый Меншчыны да веснавой пасеўнай кампаніі.

Падрыхтоўчая работа ў большасьці партыйных арганізацый акругі носіць агульны і павярхоўны характар. Раённыя камітэты яшчэ не прыступілі да кантролю і праверкі работы партыйных ячэек па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі. Аб гэтым выразна сьведчыць той факт, што ніякіх дакладных і канкрэтных вестак і матар'ялаў аб удзеле ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы раённыя камітэты вясковых партарганізацый Меншчыны яшчэ не даслалі. Паводле агульных папярэдніх вестак, асобныя раённыя камітэты КП(б)Б яшчэ не дабіліся відавочных больш-менш здавальняючых вынікаў у практычным выкананьні вызначаных плянаў па падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі.

Зусім слаба разгорнута падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў **Чэрвеньскім** і **Пухавіцкім** раёнах. Раённыя камітэты не зьвярнулі своячасова ўвагі на разгортваньне падрыхтоўчай работы. Райкомы Пухавіцкай і Чэрвеньскай партарганізацый ня здолелі забясьпечыць ажыцьцяўленьня многіх важнейшых мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі. Напрыклад, у раёнах зрываецца ачыстка збожжа. Па сёньняшні дзень у Пухавіцкім і Чэрвеньскім раёнах ачышчана толькі каля 200 тон насеньня, што складае менш 5 проц. пляну. У іншых раёнах у гэтым напрамку справа абстаіць яшчэ горш, ня гледзячы на тое, што Меншчына поўнасьцю забясьпечана машынамі на ачыстцы насеньня. Бязумоўна, значная частка віны за такі стан падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі ляжыць на парткіраўніцтве гэтых раёнаў. Ясна, што Чэрвеньскі і Пухавіцкі раённыя камітэты яшчэ зусім мала зрабілі па мабілізацыі бядняцка-сярэдняцкай грамадзкасьці наўкола задач падрыхтоўчай работы да веснавой сяўбы. Большасьць раённых камітэтаў КП(б)Б не мабілізавала ўвагі партыйных арганізацый на патрэбнасьці змагацца з разбазарваньнем насенных матар'ялаў калгасаў. Асобныя ячэйкі несваячасова даюць адпор кулацкай агітацыі за продаж насенных матар'ялаў.

Раённыя партарганізацыі Меншчыны павінны зараз-жа мабілізаваць усе свае сілы для практычнага ўдзелу ў падрыхтоўчай рабоце да веснавой пасеўнай кампаніі. Побач з практычнай работай трэба шырока разгарнуць масавую агітацыю і прапаганду палітычных задач веснавой пасеўнай кампаніі.

Г. Т.

Скажэньне Ідэі сацспаборніцтва ў АБВШ

У нашай газэце ўжо паведамлялася аб буйных недахопах у рабоце парт-арганізацыі Аб'яднанае беларускае вайсковае школы.

Сярод гэтых недахопаў нельга не адзначыць факту, які меў месца ў апошнім часе, факту скажэньня ідэі сацспаборніцтва, які практычна выявіўся ў стварэньні двух курсанцкіх «камун».

Сутнасьць справы ў тым, што група курсантаў, прачытаўшы ў газэтах паведамленьне аб стварэньні на прадпрыемствах калектываў рабочых, якія абязасабляюць сваю зарплату, парашыла гэты вопыт перанесьці ў сьцены школы, прыстасаваўшы яго да ўмоў свае працы. Стварылася ініцыятыўнае ядро, якое адкрыта вербавала прыхільнікаў свае ідэі і ў выніку арганізацыйна аформіліся дзьве курсанцкія «камуны». На арганізацыйных сходах удзельнікаў былі прыняты спэцыяльныя статуты. Вось важнейшыя пункты з іх.

«Камуна ставіць сваёю мэтай сапраўды выхаваць добрага камунара, які быў-бы сапраўды новым чалавекам».

«Група на камуністычных пачатках у сваіх радох дапускае шырокую дэмакратыю: пастановы большасьці групы зьяўляюцца абавязковымі для ўсіх сяброў групы». «Усе сябры камуны **адказваюць адзін за другога.** Ніхто з сяброў камуны ня мае права **самастойна, бяз згоды камуны, што-небудзь рабіць».** Аднэй з асноўных задач «камуны» стаіць вызначае ўзаемную дапамогу ў вучобе, імкненьне стаць прыкладнымі ва ўсіх галінах работы. «Камунары» ўжо аграмадзілі аблігацыі і грошы, якія былі ў іх, набылі патрэбныя рэчы для агульнага карыстаньня.

Мы ня можам, у рамках кароткага артыкулу, уваходзіць у абгаварэньне суб'ектыўных поглядаў і імкненьняў удзельнікаў гэтых «камун». Дый і гэта ня можа мець прынцыповага значэньня.

У даным выпадку важна тое, што ў сьцепах вайскова - навучальнае ўстановы стварыліся арганізацыі, якія аб'ектыўна ідуць **у разрэз з усімі арганізацыйнымі прынцыпамі вайсковага будаўніцтва, арганізацыі, каторыя маюць антыпартыйны, анты - армейскі характар.**

На самай справе, што значыць, ва ўмовах **армії,** кругавая парука, групавая дысцыпліна, абавязацельства працаваць паводле паказаньняў групы, на аснове **«шырокае дэмакратыі»? Гэта — ніштo іншае, як супрацьстаўленьне сябе партарганізацыі і камандваньню часьці, парушэньне асноўных палажэньняў сыстэмы армейскага кіраўніцтва, парушэньне элемэнтарных патрабаваньняў вайсковае дысцыпліны, без якой ня можа існаваць ні адна часьць.**

Падмена групаю камандваньня і парткіраўніцтва і ў такіх пытаньнях, як навучальная справа, як правіла ўнутранога распарадку (уключаючы сюды нават рэчы ўнутры - казармавага спажываньня) — таксама зьявішча **зусім недапушчальнае.**

Мабыць і нявінныя, на першы погляд, гэтыя групы аб'ектыўна адыгрывалі-б ролю фактара, які ўзрывае часьць знутры, дае магчымасьць скарыстаць іх клясавану ворагу для падрыву баявое магутнасьці Чырвонай армії. Невыпадкова, што ўжо і тут фігуруе ў аднэй з груп сын індывідуальна ападаткаванага.

Але «камуны» набываюць яшчэ важнае значэньне ў тых адносінах, што **камандваньне і ячэйка батарэі не дадалі ўсёй гэтай справе належнага значэньня, не далі належнай ацэнкі.**

І гэта здарылася, ня гледзячы на тое, што на чале груп сталі партыйцы і камсамольцы, ня гледзячы на тое, што праводзілася адкрытая вярбоўка ў «камуну», ня гледзячы на тое, што аб гэтым ведаў сакратар парт'ячэйкі, што курсанты радзіліся нават з асобнымі адказнымі работнікамі агульна - школьнага маштабу, і нават артыкул аб «камуне» быў зьмешчаны ў батарэйнай насьценгазэце.

Што яшчэ важна адзначыць — начсклад батарэі (у тым ліку і партыйны) прайшоў зусім міма таго пытаньня, якім жыло ўсё падразьдзяленьне.

Справа «з камунаю» сьведчыць аб слабасьці партыйнага кіраўніцтва ў школе, аб адарванасьці парткалектыву ад таго, чым жыве курсант, аб тым, што партарганізацыя ня здолела стаць на чале ўсё ўзрастаючай актыўнасьці кусанцкай масы і накіраваць яе па патрэбным партыі рэчышчы.

Урокі АБВШ павінны быць улічаны ня толькі вайсковымі але і грамадзянскімі партарганізацыямі, бо пытаньне аб кіраўніцтве, аб абхопе актыўнасьці мас набывае, ва ўмовах рэканструкцыйнага пэрыяду, усё большае і большае значэньне.

Д.

Культпаход камсамолу

ПЛЯН ЗАЦЬВЕРДЖАНЫ

Цэнтральны штаб ЦК ЛКСМБ распрацаваў практычныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні задач трохмесячніка беларускай пралетарскай і нацменаўскай культуры.—Масавы паход камсамолу і асьветнікаў Беларусі за ліквідацыю няпісьменнасьці і ўзмацненьне культурна-асьветнай работы на вёсцы.—Пралетарскія пісьменьнікі і паэты стварылі ўдарную літаратурную брыгаду па мастацкім абслугоўваньні трохмесячніка.—Тыдзень беларускай культуры ў РСФСР і УССР і правядзеньне тыдню украінскай культуры ў Менску

БАЯВЫМ ТЭМПАМ ВЫКАНАЕМ ПАСТАЎЛЕНЫЯ ЗАДАЧЫ

Цэнтральны штаб пры ЦК камсамолу па правядзеньні трохмесячніка беларускай пралетарскай культуры і пралеткультуры нацменшасьцяй на сваім пасяджэньні, якое адбылося пазаўчора ў ЦК ЛКСМБ, распрацаваў плян работы. У абмеркаваньні пляну прынялі актыўны ўдзел прадстаўнікі Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б, ЦК камсамолу, Наркамасьветы БССР, Галоўмастацтва, ЦП працасьветы, БелАПП'у і інш.

Плян пабудаваны ў адпаведнасьці з тымі вялізарнейшымі задачамі, якія стаяць перад трохмесячнікам беларускай пралетарскай культуры і культуры нацменшасьцяй.

Трохмесячнік павінен яшчэ больш мабілізаваць камсамол на актыўны ўдзел у культурна - нацыянальным будаўніцтве, на яшчэ большае ўзмацненьне барацьбы з ідэалёгіяй і практыкай контр - рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, і шавінізмамі ўсіх колераў, з клясава-варожымі вылазкамі на ідэалёгічным фронце за поўнае ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі камуністычнай партыі. Трохмесячнік будзе ператворан ў шырокі і масавы паход за ліквідацыю няпісьменнасьці, за ўзмацненьне культурна - асьветнай работы на вёсцы, асабліва ў раёнах суцэльнай калектывізацыі, за ўмацаваньне пазыцый пралетарскай літаратуры і мастацтва супроць варожых нам буржуазных, ідэалёгічна шкодных плыняй на гэтым фронце.

З практычных мерапрыемстваў плян прадугледжвае правядзеньне ўсебеларускага палітбою. Будзе праведзены налёт на бібліятэкі па ўсіх акругах Беларусі. Абвяшчаецца конкурс на лепшую калектыўную рэцэнзію. Баявой задачай трохмесячніка зьяўляецца паляпшэньне і ўзмацненьне культурна - асьветнага абслугоўваньня камун і калгасаў. Камсамольскія арганізацыі ў сувязі з трохмесячнікам праверяць, як ідзе падрыхтоўка кадраў, у прыватнасьці, як праводзіцца мабілізацыя тысячы камсамольцаў у ВНУ.

Вялікае значэньне набывае правядзеньне тыдню пралетарскай беларускай культуры ў РСФСР і УССР і тыдню украінскай культуры ў Беларусі. Для гэтай работы камсамол павінен мабілізаваць усе свае сілы супольна з пралетарскай грамадзкасьцю.

Саюз працасьветы, БелАПП, Белдзяржкіно і г. д. выпрацавалі свае мерапрыемствы па практычным удзеле ў трохмесячніку беларускай і нацменаўскай пралетарскай культуры. Аб гэтых мерапрыемствах інфармавалі штаб тав. **Рычкоў,** старшыня ЦП працасьветы і тав. **Галавач,** прадстаўнік БелАПП'у. Саюз працасьветы ставіць перад сабой задачу стопроцантнай ліквідацыі няпісьменнасьці сярод членаў вытворчых прафсаюзаў. Мабілізуецца настаўніцтва для дапамогі камсамолу ва ўсебеларускім агляндзе вясковых хат-чытальень. Для гэтага вылучаецца 8 брыгад, якія разгорнуць сваю работу па ўсіх акругах БССР. Асьветнікі вылучаюць брыгады ў раёны суцэльнай калектывізацыі для ўзмацненьня культ. і агульна-асьветнай работы ў камунах і калгасах. 450 батракоў сіламі камсамолу і асьветнікаў будуць падрыхтаваны для ўступленьня ў тэхнікумы і іншыя навучальныя ўстановы. Гэту работу па ліквідацыі няпісьменнасьці, узмацненьні асьветнай работы ў калгасах і падрыхтоўцы батракоў у навучальныя ўстановы асьветнікі будуць праводзіць супольна з камсамольскімі арганізацыямі.

БелАПП арганізаваў ударную літаратурную брыгаду для мастацкага абслугоўваньня рабочых мас і напулярызацыі пралетарскай літаратуры ў часе трохмесячніка. БелАПП разгортвае падрыхтоўку да правядзеньня тыдню беларускай культуры ў Маскве і на Украіне і тыдню украінскай культуры ў Менску. Вялікі ўдзел у трохмесячніку прыме піянэрская арганізацыя Беларусі. Па школах і піянэрскіх атрадах будуць праведзены масавыя гутаркі і даклады па растлумачэньні сутнасьці шавінізму ўсіх колераў, асабліва нац.-дэмакратызму, вывучэньні нацыянальнай палітыкі партыі. Піянэрская арганізацыя ў часе трохмесячніка праверыць работу дзіцячых бібліятэк. Гэта работа будзе праходзіць пад лёзунгам узмацненьня барацьбы за пралетарскую ідэалёгію ў дзіцячай літаратуры. 1.000 піянэраў мабілізуецца для ліквідацыі няпісьменнасьці. Пры цэнтральным штабе арганізаваны сэкцыі для правядзеньня практычнай работы.

Да пытаньня аб кіраўнічых партыйных кадрах

Палітычнае значэньне праблемы кіраўнічых партыйных кадраў вызначаецца ў тым, што патрэбны людзі, якія маглі-б выраш[illegible] тыя гіганцкія задачы сацыялістычнага будаўніцтва, якія стаяць перад намі і якія трэба выканаць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Да гэтага трэба дадаць, што частка кіраўнічых кадраў аказалася нездольнай забясьпечыць правядзеньне генэральнай лініі партыі, аказалася нездольнай стаяць на чале барацьбы мас з клясавым ворагам. Толькі апартуністыя могуць недаацэньваць важнасьці праблемы кадраў.

Сацыяльны склад нашых кіраўнічых кадраў зьяўляецца ў асноўным здавальняючым. Так, у выбарным апараце парторганаў мы маем рабочых 60 проц., у прафсаюзах — 75 проц., сярод гаспадарчых кадраў процант рабочых раўняецца 77 проц. Але, калі на гэтых вучастках становішча з сацыяльным складам кадраў зьяўляецца ў асноўным здавальняючым, то гэтага ніяк нельга сказаць пра цэлы рад савецкіх арганізацый. Так, у складзе кіраўнічых фінансавых кадраў — 18 проц. рабочых, НКЮ — 27 проц., органах каапэрацыі — 15 проц., у тым ліку у рабочай каапэрацыі — 29 проц. Даволі параўнаць гэтыя даныя з выпікамі чысткі партыі і савецкага апарату, каб пераканацца, што большасьць скажэньняў клясавай лініі права-апартуністычнага характару мы мелі якраз у гэтых органах. Недавальняючы **сацыяльны склад кіраўнічых кадраў гэтых арганізацый зьяўляецца адным з асноўных прычын слабой суп[illegible]емасьці апарату нашаму варожых нам клясавых сіл на гэтым установы.** Было-б грубай палітычнай памылкай сказаць, што такі процант рабочых сярод кіраўнічых кадраў вышэй пералічаных арганізацый сьведчыць аб тым, што гэта частка савецкага апарату трапіла ў рукі клясавых ворагаў і што партыя ня прымала мер да паляпшэньня складу кіраўнічых кадраў гэтых арганізацый. У адказ на такія абвінавачаньні мы можам спасылацца на наступнае: папершае, мы маем увесь час сыстэматычны паток зьнізу ўверх рабочых з вытворчасьці на кіраўнічую работу, які асабліва ўзмацніўся за апошні час. Але тэмп гэтага вылучэньня рабочых трэба значна ўзмацніць.

Акрамя гэтага, трэба ўлічыць, што за апошнія гады партыя асноўныя сілы кідала ў прамысловасьць.

Перад намі стаіць ва ўсёй сваёй шырыні праблема далейшага арабочаньня цэлага раду ўстаноў і кіраўнічых кадраў у радзе савецкіх, каапэрацыйных і культурных арганізацый. І калі спрабаваць сфармуляваць у вогуле нашу задачу, дык гэта: трэба **падвоіць** пралетарскае ядро кіраўнічых кадраў у савецкім і каапэрацыйным апараце і ў арганізацыях, якія кіруюць культурным будаўніцтвам. Гэту задачу можна ў асноўным выразіць на прапагу году ў адносінах паляпшэньня сацыяльнага складу кіраўнічых кадраў цэнтральнага і акруговага маштабу. Сілы трэба чэрпаць з трох крыніц. Першая і асноўная крыніца — рабочыя непасрэдна з вытворчасьці, з фабрык, заводаў, саўгасаў, сельскае гаспадаркі (батракі). Другой асноўнай крыніцай павінна быць далейшае прасоўваньне на больш адказную работу тых рабочых, якія ўжо раней былі вылучаны і якія на рабоце апраўдалі сябе. Трэцяй крыніцай павінны быць нашы навучальныя ўстановы.

Гаворачы аб кадрах, трэба падкрэсьліць неабходнасьць рэзкага павялічэньня ўдзельнае вагі работніц, батрачак, бяднячак у складзе кіраўнічых кадраў, трэба, каб былі зьнішчаны такія ганебныя лічбы, як 3½ проц. жаночых сярод кіраўнічых кадраў цэнтральных савецкіх установ і г. д. Партыя павінна сказаць, што тыя адносіны, якія ў нас дзе-ні-дзе ёсьць да пытаньня аб вылучэньні жанчын на практычную кіраўнічую работу, зьяўляюцца вынікам ніжэйшых яшчэ рэштак буржуазнай ідэалёгіі, эксплёатацыйных адносін да жанчыны і што павольнасьць, якая часамі праяўляецца ў гэтым пытаньні, зьяўляецца адлюстраваньнем націску клясава-варожых нам сіл.

Наступным пытаньнем, на якім трэба спыніцца падрабязьней, з прычыны яго вялізнага палітычнага значэньня, зьяўляецца праблема кадраў і нацпалітыка нашай партыі. На працягу апошняга году наша партыя вяла асабліва напружаную барацьбу з беларускім нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал-апартунізмам. Адным з галоўных аргумантаў усіх нацыянал-дэмакратаў і нацыянал-апартуністых зьяўляецца тое, што, маў, партыя «не дае ходу беларусам». Паглядзім, як у нас абстаіць справа ў гэтай галіне.

Перш за ўсё некалькі лічбаў. Склад беларусаў сярод кіраўнічых кадраў асноўных арганізацый такі: у прамысловасьці ў 1926 г. беларусаў было 14,3 проц., а ў 1929 г. — 32,4 проц.; у складзе праўленьня банкаў: у 26 г. было 38,5 проц. беларусоў, а ў 1929 г. — 47 проц.; у акруговым савецкім апараце— 26 г. было 48,6 про

Многія калгасы яшчэ не пачалі падрыхтоўкі да сяўбы

Пасеўныя пляны да калгасаў не даведзены

Ачыстка насеньня ідзе чарапашым тэмпам

МАЦНЕЙ ВЫТНЕМ ПА КУЛАЦТВЕ, ЯКОЕ ШАЛЁНА СУПРАЦІЎЛЯЕЦЦА КАЛГАСНАМУ БУДАЎНІЦТВУ

Абмалот азімых і яравых не закончаны

(Ад нашага мазырскага карэспандэнта)

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў калгасах Мазыршчыны разгортваецца вельмі слаба. Акруговы калгассаюз толькі зараз заканчвае складаньне вытворчага пляну. Гэта зьяўляецца прычынай таго, што **плян веснавой сяўбы да асобнага калгасу яшчэ не даведзены і ім невядомы.**

Наколькі слаба ідзе падрыхтоўчая праца ў саміх калгасах, сьведчыць той факт, што да гэтага часу ва многіх з іх **не закончаны абмалот ні азімых, ні яравых, ня зданы яшчэ закантрактаваныя культуры.**

Недапушчальна **слаба ідзе ачыстка насеньня.** Часткова гэта тлумачыцца недахватам машын па ачыстцы збожжа. **На сельсавет прыпадае толькі 1 трыер і адзін «трыумф».** Павінна ўжо было быць завезена 105 трыераў і 195 «трыумфаў», але фактычна гэты плян выкананы ўсяго на 15 проц.

Здавальняюча праходзіць арганізацыя насенных фондаў у новых калгасах. У кожным новым калгасе адразу-ж пасьля яго афармленьня, як правіла, абгульняецца насеньне і складаюцца насенныя фонды. Абмен калгаснага звычайнага насеньня на чыста гатунковае яшчэ не праходзіць.

Пытаньне калектывізацыі гэта адзінае пытаньне, якім зараз толькі цікавяцца ў раёнах суцэльнай калектывізацыі. Уся праца як партыйных, так і савецкіх і прафэсыянальных арганізацый накіравана выключна на хутчэйшы ахоп калектывамі раёнаў суцэльнай калектывізацыі. Да сучаснага моманту Юравіцкі раён калектывізаваны на 55 проц., Калінкавіцкі і Каралінскі—на 40 проц., Тураўскі—на 43 проц. У гэтых раёнах рабочая жывёла абагулена на 75 проц., прадукцыйная жывёла—на 50 проц., с.-г. інвэнтар—на 80 проц.

Побач з нагалоўным уступленьнем бядняцка-серадняцкага сялянства ў калгасы наглядаецца рад выпадкаў, калі заможная частка вёскі актыўна супроцьдзейнічае калгаснаму будаўніцтву як агітацыяй, так і дзеяньнем. Аднак, бядняцка-серадняцкае сялянства адразу рэагуе на вылазкі кулацтва пагалоўным уступленьнем у калгасы, катэгарычнымі патрабаваньнямі выслаць клясавых ворагаў з акругі і г. д.

Да апошняга часу ў акрузе наглядаўся масавы продаж **жывёлы як сялянствам, якое ўступае ў калгасы, так і самімі калгасамі.** Асабліва моцна гэтае зьявішча было разьвіта ў раёнах суцэльнай калектывізацыі. У вёсцы Копчыцы, напрыклад, сяляне за адну ноч прадалі 60 галоў жывёлы. Сяляне в. Рудня, Жыткавіцкага раёну, арганізаваўшыся ў калгас, пастанавілі прадаць 104 каровы, матывуючы гэта недахватам кармоў.

Як мясцовыя, так і прыезджыя загатоўшчыкі скарыстоўвалі ўсе магчымасьці, каб больш загатовіць кароў, часта дапамагаючы разбазарваньню жывёлы. Мясцовым органам прышлося пачаць барацьбу з загатоўшчыкамі.

Зараз, дзякуючы прынятым мерам, масавае разбазарваньне жывёлы ўдалося зьменшыць. Дакладны ўлік жывёлы ў калгасах, у гаспадарках, што ўваходзяць у калгасы, забарончыя пастановы сельсаветаў і растлумачальная кампанія зрабілі сваю справу. Цікава, што найбольш сьвядомыя сяляне самі павялі барацьбу з членамі калгасаў, якія разбазарваюць сваю жывёлу.

Папаўненьне гуртоў калгасаў малочнай жывёлай праводзіцца ўжо, але пакуль што яшчэ вельмі слаба. Да гэтага часу калгасам перадана ўсяго 133 малочныя каровы, 34 бугаі і 22 галовы пляменнага маладняка.

Заслугоўвае быць адзначаным тое, што мазырскія калгасы пачалі ўжо зьбіраць другарадныя прадукты экспарту. Некаторыя калгасы ўжо здалі на загатоўчыя пункты шэрсьць, конскі волас і інш. Што датычыць збору задаткаў на трактары, то гэта справа чамусьці выявілася ў тым, што арганізавалі па калгасах скарбоначныя зборы замест таго, каб сур'ёзна аднесьціся да гэтага пытаньня і выдзеліць спэцыяльныя таварныя фонды на куплю трактараў.

Увогуле, абслугоўваньне калгасаў спэцыяльнымі відамі сельска-гаспадарчай каапэрацыі ў апошні час палепшылася.

Зараз па раёнах ідзе рэарганізацыя сыстэмы с.-г. каапэрацыі, ствараюцца раённыя зьвяньні сельгассыстэмы, арганізуюцца кусты і райкалгассаюзы ў раёнах суцэльнай калектывізацыі. Трэба ўсё-ж адзначыць, што калгасныя сэкцыі пры спэцыяльных відах сельскакаапэрацыі яшчэ ня створаны, і работа яшчэ не распачата.

В.

Пачынаецца агляд работы каапэрацыі

У барацьбу за рэальную заработную плату

Цэрабсэкцыя, сумесна з ЦСПСБ, распрацавала падрабязны плян арганізацыі масавага агляду работы каапэрацыі.

Усяго ў аглядзе каапэрацыі прыме ўдзел 487 рабочых брыгад у складзе 1925 чалавек. З іх 242 брыгады абсьледуюць 382 галоўнейшыя харчовыя крамы; 128 брыгад абсьледуюць 177 непрадуктовых крм. 62 брыгады вылучаны для абсьледваньня сталовак і чайных, 16 брыгад абсьледуюць хлебазаводы, пякарні і хлебныя крамы, 21 брыгада праверыць становішча складаў ЦРК і 18 брыгад вылучана для праверкі апаратаў ЦРК. Вылучаюцца таксама спэцыяльныя брыгады па абсьледваньні цэн.

У кожным гораДзе кіраваць абсьледваньнем будзе цэнтральная брыгада, вылучаная ЦСПСБ. Акрамя таго да работы на аглядзе будуць прыцягнуты каапэрацыйны актыў, жанрэлегаткі, хатнія гаспадыні, «лёгкая кавалерыя» і па лініі саюзу саўгандальслужачых работнікі прылаўку, рахунковыя работнікі і ўканамістыя.

Цэрабсэкцыя, сумесна з ЦСПСБ, выпрацавала спэцыяльную памятку для брыгадзіраў па абсьледваньні крам ЦРК. Памятка падкрэсьлівае, на што брыгады павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу. Да абсьледваньня брыгады павінны прыцягнуць саміх работнікаў крам, работнікаў эканомкамісій і каапэрацыйна-крамныя камісіі. Ацэнка работы абсьледванай крамы павінна быць праверана на шырокіх сходах рабочых спажыўцоў.

Брыгадам прапануецца зьвярнуць асаблівую ўвагу на штат, памяшканьне крамы, унутраное абсталяваньне і забесьпячэньне інвэнтаром.

Рабочыя брыгады павінны **праверыць, як выконваюцца дырэктывы аб зніжэньні цэн на асноўныя прадукты рабочага спажываньня,** на хлеб, мяса і інш. прадукты і тавары шырокага спажываньня. Неабходна, каб брыгады павялі рашучую барацьбу са стратамі, і псаваньнем тавараў.

Памятка прапануе брыгадам зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на **выкананьне цэрабкопамі рацмінімуму,** правядзеньне сыстэмы папярэдніх заказаў, дастаўкі тавараў на дом, а таксама на тое, як праведзены каапэрацыяй пераход на бесьперапынны гандаль і двухзьменны гандлёвы дзень.

Брыгадам трэба таксама праверыць **парадак і тэхніку водпуску дэфіцытных тавараў.** Агляд павінен паказаць, ці маюць месца выпадкі продажу тавару прыватнікам, няправільнага водпуску дэфіцытных тавараў і інш. ненармальнасьці.

Сур'ёзная ўвага брыгадамі павінна быць зьвернута **на праверку грамадзкага харчаваньня, якасьці і кошту абедаў,** а таксама **санітарна-гігіенічнага становішча сталовак.**

Пры праверцы структуры апарату **цэрабкопаў** рабочым брыгадам трэба праверыць **правільнасьць разьмеркаваньня функцый** паміж работнікамі апарату; як наладжаны прыём наведвальнікаў і рэагаваньне на іх заўвагі. Брыгады павінны высьветліць, як цэрабкопы праводзяць дырэктывы партыі і ўраду аб арабочаньні апарату і вылучэньстве.

Асноўны лёзунг агляду: **зьніжэньне цэн у рабочай каапэрацыі на 3-4 проц., у першую чаргу за лік ліквідацыі страт, растрат і мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў самой каапэрацыі.**

Рабочыя брыгады арганізуюцца ў ліку ад 3 да 7 чалавек для кожнага абсьледаванага прадпрыемства, або крамы, сталоўкі і г. д.

Пасьля сканчэньня праверкі будуць праведзены **шырокія нарады ўдзельнікаў брыгад** для падагульваньня вынікаў агляду.

Рабочыя брыгады павінны шырока інфармаваць рабочых заводаў, якія іх вылучылі, аб праведзенай рабоце і яе выніках.

Сёньня з 9-й гадзіне раніцы адбудзецца шырокая нарада брыгад па распрацоўцы праграмы агляду.

У бліжэйшыя дні брыгады выедуць у акругі.

Крэдыты на куплю жывёлы не скарыстаны

(Ад нашага віцебскага карэспандэнта)

Плян веснавой пасеўнай кампаніі хоць ужо і складзены, але не даведзены яшчэ да асобнага калгасу. На Віцебшчыне павінна быць арганізавана 15 спэцыяльных калгасаў, у тым ліку 7 сьвінагадоўчых, 3 малочна-гародныя, 7 ільнавод ных і 2 садаводныя. Але да арганізацыі гэтых калгасаў фактычна яшчэ ня прыступлена, акрамя водпуску 15.000 руб. крэдытаў на пабудову хлявоў для жывёлы.

Ужо пачалі працаваць курсы кіраўнікоў калгасаў на 44 чал. Курсы ўкамплектаваны з актывістых-калгаснікаў з раёнаў суцэльнай калектывізацыі. Адчыніліся таксама і курсы садаводаў пры дасьледчай станцыі Падгорэзьзе. Курсы рахункаводаў яшчэ не адкрыліся з прычыны адсутнасьці памяшканьня для курсантаў.

Вакол Віцебску вызначана арганізаваць тры буйныя малочныя фэрмы. На куплю жывёлы для гэтых фэрмаў ужо адпушчана 37 тыс. руб., але як скарыстоўваюцца гэтыя грошы, акркалгассаюз ня ведае.

Прафсаюзы Віцебшчыны рыхтуюцца да ўдзелу ў надыходзячай пасеўнай кампаніі. На адным з апошніх пасяджэньняў акрпрафбюро пастаноўлена мабілізаваць 500 рабочых, якія будуць пасланы на некалькі тыдняў у вёску да падрыхтоўчай работы ў асобных калгасах. Перад выездам для рабочых-брыгадзіраў будуць арганізаваны кароткатэрміновыя курсы канфэрэнцыі. Група рабочых выедзе на вёску і ў часе самой сяўбы.

На правядзеньне гэтага мерапрыемства патрабуецца каля 100 тыс. руб. З гэтай мэтай прафсаюзы мяркуюць правесьці дзень калектывізацыі на прадпрыемствах.

ІБІН.

„РАБОТА КОЖНАГА КАМУНІСТАГА І КОЖНАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ НА ЎВЕСЬ БЛІЖЭЙШЫ ЧАС БУДЗЕ СПРАЎДЖАЦЦА ПАПЕРШ НА ТЫМ, У ЯКОЙ МЕРЫ ЯНЫ ЗМОГУЦЬ ДАВЕСЬЦІ КАНКРЭТНЫ ПЛЯН ПАСЕЎНАЕ КАМПАНІІ ДА КОЖНАГА СЯЛА І КАЛГАСУ" (З АДОЗВЫ ЦК УсеКП(б)

АСЬВЕТНІКІ, НА ДАПАМОГУ СЯЎБЕ!

Разгорнем спаборніцтва паміж калектывамі асьветнікаў на лепшае правядзеньне с.-г. кампаніі

Адозва ЦП саюзу працаўнікоў асьветы

У сувязі з надыходзячай веснавой пасеўнай кампаніяй, ЦП саюзу працаўнікоў асьветы зьвярнулася з адозвай да ўсіх асьветнікаў БССР, у якой заклікае прыняць самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да сяўбы.

«Лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б), гаворыцца ў адозьве, адзначыў, што той пералом, які адбыўся ў найшырэйшых масах сялянства ў адносінах да калектывізацыі сельскай гаспадаркі, павінен у надыходзячую пасеўную кампанію зрабіцца адпраўным пунктам для новага руху ўперад у галіне ўздыму бядняцка-серадняцкай гаспадаркі і сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Зацьверджаны СНК БССР плян сельска-гаспадарчай кампаніі 1930 г. і пастановы лістападаўскай сэсіі ЦВК БССР зьяўляюцца дакумантамі буйнейшага палітычнага значэньня.

Перад намі, як прафсаюзнай арганізацыяй, стаіць задача прыняць усё неабходнае для самага шырокага актыўнага ўдзелу ў дапамозе партыі і савецкай уладзе ў ажыцьцяўленьні гэтых пастаноў.

Наш саюз, саюз асьветнікаў, значная частка якога знаходзіцца на вёсцы, ужо зараз павінен паставіць перад сабой канкрэтныя задачы свайго ўдзелу ў веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі.

Першае — гэта дабіцца поўнага ўяўленьня масай асьветнікаў вялікага палітычнага значэньня гэтай кампаніі. Ужо зараз кожны асьветнік павінен праводзіць растлумачальную работу сярод батрацкіх, бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі аб дырэктывах партыі і ўраду ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Кожны асьветнік павінен дапамагчы сельсаветам арганізаваць беднату для паступленьня на рэшткі капіталістычных элемэнтаў.

Трэба растлумачыць кожнаму батраку, бедняку і серадняку пастановы ўраду і мясцовых выканкомаў аб тым, што канкрэтна павінна быць зроблена ў даным раёне ў галіне калектывізацыі, пашырэньня пасеўнай плошчы, уздыму ўраджайнасьці і паляпшэньня жывёлагадоўлі.

Да веснавой с.-г. кампаніі павінны быць прыцягнуты ня толькі асьветнікі вёскі, але і гораду. Пасылка ў вёскі брыгад з лепшых асьветнікаў, прыняцьце шэфства над калгасамі, збор с.-г. літаратуры, уцягненьне ў кампанію вучняў—усё гэта павінна быць скарыстана, як мага лепш і шырэй.

Разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва паміж групамі, раённымі калектывамі асьветнікаў на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой с.-г. кампаніі, прывядзеньне сябе ў баявую гатоўнасьць—павінна стаць у цэнтры ўвагі ўсёй масы асьветнікаў. Пытаньні пасеўнай кампаніі трэба пырока асьвятляць у пасьценгазэтах, пэрыядычным друку і на агульных сходах асьветнікаў».

У заключэньне ЦП саюзу працаўнікоў асьветы выказвае ўпэўненасьць у тым, што перадавая частка асьветнікаў пад кіраўніцтвам партарганізацыі прыме ўсе належныя меры, каб поўнасьцю выканаць тыя задачы, якія партыя паставіла ў гэтым годзе перад працоўнымі масамі.

Насенныя фонды ня створаны

(Ад нашага полацкага карэспандэнта)

Плян веснавой сяўбы, як па ўсёй акрузе, так і па лініі калгасаў ужо выпрацаваны. Аднак, **да асобнага калгасу плян яшчэ не даведзены.** Гэта работа толькі-толькі пачынаецца.

Адным з самых адмоўных зьявішч трэба лічыць тое, што **стварэньне насенных фондаў** як на новых калгасах, так і па старых, якія парэлічылі свае плошчу **праходзіць дрэнна.** Ссылкі ў агульны сьвіран насеньня яшчэ няма. Пакуль што абмяжоўваюцца тым, што бяруць на вучот колькасьць рознага насеньня паасобных гаспадароў. У некаторых мясцох пры стварэньні фондаў **скрыўляецца клясавая лінія.** Вылічваецца патрэбная для засеву колькасьць насеньня і гэта колькасьць разьмяркоўваецца роўнамерна на ўсіх працаздольных членаў калгасаў. Такім чынам, і бядняк, і серадняк павінен уносіць аднолькавую колькасьць насеньня ў насенны фонд.

Ня гледзячы на тое, што плян завозу Паляводсаюзам насеньня і ўгнаеньня дакладна распрацаваны, аднак, ні насеньне, ні ўгнаеньне яшчэ не паступае.

Ачыстка збожжа і збор попелу па калгасах праходзіць нездавальняюча. Калгасы збожжаачышчальнымі машынамі не забясьпечаны і карыстаюцца машынамі прыватных прадпрыемстваў. Ніякіх мерапрыемстваў да перакідкі збожжаачышчальных машын з раёнаў, дзе няма калгасаў у раёны, дзе іх ёсьць шмат, ня прынята. Некаторыя калгасы, праўда, попел зьбіраюць, але ўвогуле гэта носіць толькі выпадковы характар і ў сыстэму не ўвайшло.

Пасьля правядзеньня растлумачальнай кампаніі і абвяшчэньня, што члены калгасаў, якія прададуць жывёлу, будуць выключаны з калгасаў, разбазарваньне жывёлы значна зьменшылася. Продаж жывёлы членамі калгасаў зараз носіць толькі выпадковы характар. Бываюць выпадкі продажу насеньня і інвэнтару як членамі калгасаў, так і сялянскімі гаспадаркамі, якія маюць увайсьці ў калгас.

Да гэтага часу ў акрузе яшчэ няма вестак, як ідзе ўкамплектаваньне стада калгасаў.

Нічога ня зроблена Акркалгассаюзам у галіне збору задаткаў на трактары і арганізацыі збору калгасамі рэчаў другарадпага экспарту.

Арганізацыя калгасаў сустракае актыўнае супраціўленьне з боку кулацтва. Кулацтва ўжывае ўсе мэтады баранЬбы пачынаючы з лістоў з пагрозамі і падпольнымі сходамі і канчаючы збойствам калгаснікаў.

Падагульваючы вынікі падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі ў калгасах Полаччыны, трэба канстатаваць, што **фактычна падрыхтоўка да сяўбы яшчэ не пачыналася.** Ні акруговыя **установы,** ні акруговыя грамадзкія арганізацыі яшчэ ня прынялі належных крокаў да яе разгортваньня.

НІЛ.

Мензакркалгассаюз не падрыхтаваны да веснавой сяўбы

Да гэтага часу Менакркалгассаюзам пляны пасеўнай кампаніі яшчэ не накіраваны ў паасобныя калгасы. Ужо больш 3-х тыдняў, як пляны накіраваны ў акрплян для ўзгадненьня, але да гэтага часу яны ляжаць бяз руху, і калгасы ня ведаюць аб разьмеры пасеўнай плошчы, колькасьці неабходнага насеньня і г. д. Акркалгассаюз ня мае вестак аб тым, як праходзіць ачыстка насеньня ў калгасах.

У новых калгасах не праводзіцца выяўленьне насенных фондаў. Ёсьць небясьпека, што гэтыя фонды разбазарваюцца. Месцы мала зварачаюць увагі на пытаньні выяўленьня насенных фондаў. Вельмі слаба забясьпечаны калгасы неабходнымі мінэральнымі ўгнаеньнямі. Адпушчана толькі 8,9 проц. патрэбнай колькасьці.

НЯДБАЙНЫЯ АДНОСІНЫ УСТАНОЎ ДА СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ СЬМІЛАЎШЧЫНЫ

Прэзыдыум Менскага акрвыканкому заслухаў вынікі праверкі выкананьня сваіх пастаноў па суцэльнай калектывізацыі Сьмілаўшчыны. Прэзыдыум канстатаваў бюракратычныя адносіны ўсіх устаноў і арганізацый да пастаноў акрвыканкому. Большасьць устаноў і арганізацый ня выканала даручэньняў акрвыканкому аб правядзеньні пэўных мерапрыемстваў для суцэльнай калектывізацыі ў Сьмілавіцкім раёне. Белсельтрэст, напрыклад, якому было даручана да сакавіка месяца арганізаваць у Сьмілаўшчыне дзьве трактарныя калёны, абсалютна нічога яшчэ не зрабіў.

На чарговым пасяджэньні прэзыдыуму АВК будуць заслуханы даклады ўсіх устаноў, што імі зроблена для справы суцэльнай калектывізацыі Сьмілавіцкага раёну. Раду ўстаноў дручана не пазьней 4-га студзеня камандыраваць у Сьмілаўскі раён адказных работнікаў і спэцыялістых па калектывізацыі.

Скрыўленьне клясавай лініі пры стварэньні насенных фондаў

(Ад нашага гомельскага карэспандэнта)

Пляны пасеўнай кампаніі для калгасаў яшчэ ня складзены. Толькі з 1-га студзеня працаўнікі акруговых апаратаў накіраваны ў раёны для складваньня там плянаў непасрэдна ў калгасах.

Аб тым, як ідзе абагуленьне маемасьці ў калгасах, стварэньне насенных фондаў, акркалгассаюз ня ведае. Невядома яму таксама, як ідзе ачыстка збожжа ў калгасах. Між тым, калгасы забясьпечаны машынамі па ачыстцы збожжа ў належнай ступені і пры правільным і мэтазгодным іх выкарыстаньні можна ачысьціць усё насеньне.

Збор насеньня па некаторых калгасах рабіўся па мэтадзе ўраўнілаўкі — як беднякі, так і сераднякі ўносілі аднолькавую колькасьць насеньня. Зразумела, што гэта ёсьць скрыўленьне клясавай лініі. Пры стварэньні насенных фондаў патрэбна выходзіць з магутнасьці тай ці іншай гаспадаркі.

Трэба адзначыць, што акркалгассаюз, паляводсаюз і садаводсаюз не ўзгаднілі паміж сабой плянаў веснавой пасеўнай кампаніі і ў выціку атрымліваецца рознабой. Так, напрыклад, садаводсаюз запраектаваў пашырыць сады на 1.100 гэкт., у той час, як акркалгассаюз па пляне вызначыў значна менш. Таксама і ў адносінах насеньня няма ўзгодненасьці паміж Калгассаюзам і Паляводсаюзам.

Ужо працуюць курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў для калгасаў. На курсах навучаецца 80 чал., з іх 10 рабочых, 5 дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, рэшта — калгаснікі. Курсы па падрыхтоўцы рахункаводаў для калгасаў яшчэ не адкрыты. У Басілевічах, Рэчыцкага раёну, працуюць курсы па падрыхтоўцы 40 трактарыстых.

Калгасамі і грамадзкімі арганізацыямі ўжо сабрана 60 тыс. руб. задаткаў на трактары, с.-г. машыны і ўгнаеньне.

Паводле пастановы акрвыканкому Лоеўскі і Хойніцкі раёны выдзелены, як раёны суцэльнай калектывізацыі. Зараз Лоеўскі раён ужо калектывізаваны на 65 проц., а Хойніцкі — на 55 проц. Вядзецца таксама падрыхтоўка па суцэльнай калектывізацыі Буда-Кашалёўскага раёну, які зараз калектывізаваны на 20 проц. Уваравіцкі раён калектывізаваны на 45 проц., а Брагінскі — на 40 проц. Ва Ўваравіцкім раёне арганізоўваецца калгас-гігант на плошчы ў 30 тыс. гэкт.

Кулацтва аказвае шалёнае супраціўленьне калектывізацыі і часамі нераходзіць да адкрытых дзеяньняў супроць калгасаў. Так, нядаўна ў Брагінскім раёне кулакамі забіты член сельсавету, ініцыятар калектывізацыі. У Чачэрскім раёне кулакамі быў кінуты ў калодзеж актывісты-калгаснікі. У некаторых калгасах кулакі спалілі сена і збожжа калгаснікаў. Бядняцка-серадняцкія масы даюць рэзкі адпор кулацкім выступленьням.

Б.

Пачнем падрыхтоўку да будаўнічага сэзону

52 млн. руб. на капітальнае будаўніцтва ў прамысловасьці

ПАЛЕПШЫМ ЯКАСЬЦЬ БУДАЎНІЦТВА, ЗНІЗІМ САБЕКОШТ

У друку нядаўна была апублікавана пастанова Саюзнага СНК аб мерах па аздараўленьні, паляпшэньні і рацыяналізацыі будаўніцтва ў надыходзячым будаўнічым сэзоне.

Гэта пастанова павінна стаць настольнай кнігай для ўсіх устаноў і арганізацый, так ці інакш зьвязаных з будаўніцтвам. У гэтым годзе нам патрэбна ва што-б там ні стала выраўнаць гэты вучастак гаспадарчай работы, падагнаўшы яго да агульнага імклівага тэмпу індустрыялізацыі.

Паглядзім зараз, як-жа ў нас, у Беларусі, становішча з капітальным будаўніцтвам у прамысловасьці — гэтым найбольш важным і адказным зьвяном усёй будаўнічай справы. На капітальнае будаўніцтва ў прамысловасьці асыгнуюцца вялізарныя сродкі — у мінулым годзе звыш 25 мільёнаў руб., у гэтым годзе — 52 млн. руб. і ў будучым годзе — 120 мільёнаў руб.

Гэтыя вялізарныя сродкі народных грошай, якія затрачваюцца на капітальнае будаўніцтва, абавязваюць. Надыходзячы новы будаўнічы сэзон прымушае нас згуртаваць увагу да дасканалага аналізу будаўніцтва ў мінулым годзе і да падрыхтоўкі да новага будаўніцтва.

Плян па капітальным будаўніцтве ў Беларусі ў мінулым годзе ў сярэднім выкананы нават з некаторым перавышэньнем. Перавышэньне ў выкананьні пляну мы маем па панчошна-трыкатажнай фабрыцы (155 проц.), на прадпрыемствах Скуртрэсту (125 проц.), Белдзяржсьпірту (120 проц.), Лесбелу (105 проц.), Шкэйтрэсту (104 проц.), акулярнай фабрыцы (101 проц.). Але ў той-жа час мы маем і недавыкананьне будаўнічых работ, часамі досыць значнае, па цэлым радзе прамысловых аб'ектаў. Напрыклад, па Аршанскім ільна-прадзільным камбінаце, Віцебскім шчацінным камбінаце, Добрускай папяровай фабрыцы, заводу тарфяных ізаляцыйных плітак (Аболь, Полацкая акруга), на Віцебскім маслабойным заводзе, крухмальным заводзе ў Чырвоным Беразе і некаторых іншых.

Гэта з выкананьнем пляну. Але вось у некаторых прамысловых аб'ектах, якія ў нас на працягу мінулага году пабудаваны, ня былі ўнікнуты дэфэкты, часамі досыць істотныя — гэта ўжо зусім дрэнна і прымушае нас быць напагатове. Найбольш буйны дэфэкт мы маем на новай пабудаванай Гомельскай цагельні, дзе скляненьне ва ўсю даўжыню дало шчыльны і асела — вядзецца сьледзтва, якое ўстановіць вінаватых. Яшчэ выяўлены наступныя дэфэкты будаўніцтва — некаторую асадку скляненьня дала Менская цагельня, дэфэкты кладкі фундаманту і сьцен выяўлены на Крычаўскім фасфарытным заводзе і на крухмальным заводзе ў Чырвоным Беразе, у новым будынку Гомельскага сельмашу выяўлены грыбкі ў падлозе (з прычыны чаго прышлося разабраць падлогу).

Як нашае прамысловае будаўніцтва выканала дырэктыву аб зьніжэньні выдаткаў на 15 проц.? Даць дакладны адказ на гэтае пытаньне мы пакуль што ня можам, бо яшчэ няма поўнага ўліку. Адно можна сказаць, што тут у нас яўны прарыў. Праўда, у нас ёсьць заявы трэстаў і асобных прадпрыемстваў аб мяркуемым зьніжэньні, але гэта толькі папяровыя заявы, меркаваньні, якія невядома як ажыцьцёўлены на практыцы. Так, Гомсельмаш чакае зьніжэньня сабекошту на 11 проц., запалкавыя фабрыкі (па паасобных аб'ектах) — на 5 проц., Харчтрэст (па праектаваньні) — на 8 проц., Белторф — на 17 проц., панчошна-трыкатажная фабрыка — на 15 проц. Што-ж датычыць галянтарэйнай фабрыкі, ды яна паведамляе, што чакае зьніжэньня «наогул», не паказваючы нават разьмеру — наіўныя, нічога ня вартыя абяцаньні.

А некаторыя трэсты і прадпрыемствы нават і не чакаюць зьніжэньня—да такіх адносіцца Белдзяржсьпірт, Кожтрэст, Страмтрэст. Пры чым, калі Белдзяржсьпірт хоць матывуе гэтае сваё «нечаканьне» зьніжэньня сабекошту, спасылаючыся на павышэньне канцтоўнасьці мэталёвага абсталяваньня, дык іншыя пералічаныя трэсты нават і матывоўкі ня прыводзяць...

На гэты год устаноўлена зьніжэньне будаўнічага індэксу на 28 проц. у параўнаньні з 1927-28 годам. Такім чынам, асабліва вялікую напружанасьць прыдасьць вытрымаць тым будуючым трэстам, якія ў мінулым годзе не далі зьніжэньня—ім прыдзецца моцна падцягнуцца і адшукаць усялякія спосабы для выкананьня дырэктывы ўраду.

Надзвычайна важным прадстаўляецца таксама забесьпячэньне будаўніцтва тэх нічным пэрсаналам і рабочай сілай. У мінулым годзе мы на некаторых пабудовах мелі прастоі ў ходзе работ з-за часовай адсутнасьці рабочай сілы. Такія прастоі ўдаражаюць будаўніцтва. Наркампрацы трэба будзе пільна і загадзя папрацаваць над падрыхтоўкай рабочай сілы, бо аб'ём капітальнага будаўніцтва ў нас у гэтым годзе ў два разы больш, чым у мінулым.

А што ў нас робіцца з падрыхтоўкай ніжэйшага тэхнічнага пэрсаналу, з дакваліфікацыяй рабочых-будаўнікоў, з арганізацыяй курсаў для дзесятнікаў, мы пакуль што нічога ня чуем аб гэтым, і можна выказаць апаску, што тут патрэбная работа не разгорнута.

Некалькі слоў аб будаўнічых матар'ялах. З прычыны востраго дэфіцыту некаторых будаўнічых матар'ялаў нам трэба добра падумаць аб скарыстаньні ўсякіх мажлівасьцяй, аб адшуканьні ўласных рэсурсаў і замене дэфіцытных матар'ялаў іншымі матар'ялямі. Напрыклад, будаўнічым арганізацыям трэба будзе загадзя запасьціся ру бероідам, шыферам, чарапіцай і толем для скарыстаньня іх замест востра дэфіцытнага дахавага жалеза. Трэба па старых будоўлях арганізаваць збор цьвікоў, балтоў і гаек, якія там засталіся ў старых рыштаваньнях. Таксама неабходна свячасова прадбачыць замену жалезных канструкцый драўлянымі, або жалеза-цагельнымі.

Л. Н—ДАЎ.

Зьезд калгасьнікаў Гарадоцкага раёну вітае „Зьвязду"

Рэдакцыя «Зьвязды» атрымала прывітальную тэлеграму ад 1-га зьезду калгасьнікаў Гарадоцкага раёну. У тэлеграме зьезд запэўняе, што ўся работа па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі пойдзе на шляху, што вызначаны камуністычнай партыяй.

ШУРЭІН.

ВЫРАШЫМ МЯСНУЮ ПРАБЛЕМУ

Белсельтрэст і малочны саюз павінны адкарміць для забесьпячэньня прамысловых цэнтраў 10.000 шт. рагатае жывёлы і 60.000 шт. сьвіней

Белмясгандаль адмаўляецца ад заключэньня ўмовы

Пастановай ЦК УсеКП(б) Белсельтрэст абавязаны ў 1929-30 годзе адкарміць 10.000 шт. рагатай жывёлы і 10.000 шт. сьвіней.

Да гэтага часу на адкормачных пунктах Белсельтрэсту фактычна пастаўлена ўжо 3.000 шт. жывёлы.

У хуткім часе чакаецца дадатковае атрыманьне з Украіны 3.000 шт. жывёлы. У лютым будзе пастаўлены на адкорм яшчэ 4.000 шт.

На працягу двух дзён Белсельтрэст распрацуе плян канкрэтнага выкананьня ўсяго гадавога заданьня па адкорме рагатай жывёлы, згодна пастановы ЦК да вясны, а не на працягу ўсяго году.

Надзвычайна цяжкое становішча з памяшканьнямі для адкорму рагатай жывёлы. Белсельтрэст прыстасоўвае для гэтай мэты гумны і іншыя будынкі. Тое-ж самае і ў адносінах забесьпячэньня моцнымі кармамі і асабліва подсьцілам.

Першапачатковае заданьне Наркамгандлю на адкорм 6.000 сьвіней Белсельтрэст мяркуе выканаць поўнасьцю ў зімовы час. Заключана ўмова на 3.080 сьвіней з Белмалжысьсаюзам.

Белмясгандаль амаль на працягу месяца катэгарычна адмаўляецца ад заключэньня ўмовы на дастаўку сьвіней для адкорму ў саўгасах. Белсельтрэст давёў аб гэтым да ведама НК РСІ. Аднак, умова яшчэ дагэтуль не падпісана.

Для выкананьня заданьня па адкорме сьвіней і кароў у 1930-31 годзе выступіць праект арганізацыі ў Беларусі спэцыяльных мясных прамысловых гаспадарак.

Задачы па вырашэньні мясной праблемы вымагаюць ад саўгасаў і рабочых калектываў ударных мэтадаў работы і магчыма хутчэйшай перадачы Белмалжысаюзу і Белмясгандлем сьвіней згодна ўмоў.

Баявое заданьне малочнай каапэрацыі

На малочна-жывёлагадоўчую каапэрацыю ўрадам ускладзена важнейшая задача—адкарміць на працягу 1930 году ў калгасах 50.000 сьвіней. Палова гэтае колькасьці сьвіней павінна быць адкормлена і перадана каапэрацыі не пазьней 1-га красавіка 1930 году, а рэшта —не пазьней 1-га жніўня. Пры гэтым трэба падкрэсьліць, што сьвіньні павінны купляцца толькі ў калгасах, а не ў індывідуальных гаспадарках.

Гэтае заданьне ўжо разьмеркавана малочным саюзам па ўсіх акругах БССР. Меншчына павінна даць 7.350 штук сьвіней, Бабруйшчына—7.450, Мазыршчына—4.600, Магілеўшчына — 9.000, Гомельшчына—7.000, Ворша—5.250, Віцебшчына—5.200 і Полаччына—4.200.

Для таго, каб выканаць гэтае важнейшае заданьне ў тэрмін, неабходна зараз-жа прыступіць да яго правядзеньня ва ўдарным парадку.

Акруговыя калгассаюзы павінны разьмеркаваць вызначаную для іх колькасьць сьвіней на кожным калгасе, выходзячы з наяўнасьці сьвінога гурту калгасу.

Калгасам трэба даць падрабязныя інструкцыі аб парадку адкорму сьвіней і догляду за імі. У якасьці кармоў трэба скарыстоўваць усе адкіды, якія ёсьць у гаспадарках.

Паводле няпоўных вестак, якія ў нас ёсьць, пакуль што па калгасах прыступлена да адкорму толькі 1.600 сьвіней.

Да акруговай агітпрапканфэрэнцыі МОПР'у

З кожным днём Мопраўская арганізацыя значна расьце. Арганізуюцца новыя ячэйкі і праводзіцца масавая вярбоўка працоўных гораду і вёскі ў члены Мопру, шляхам спаборніцтва паміж акругамі, райкомамі і нізавымі ячэйкамі.

Гэты значны рост радоў Мопру таксама алічваецца і ў Менскай акруговай арганізацыі. Заключаны дагавор па спаборніцтве паміж Менскім і Гомельскім АК выклікаў вялікую зацікаўленасьць вясковых райкомаў і ячэек і гэта дало ўжо свае вынікі. Асабліва спаборніцтва ідзе за лік росту сялян, арганізацыі ячэек па калгасах і саўгасах, ліквідацыі ўсіх выгладаў запазычанасьці і вярбоўкі падпішчыкаў на часопіс «Путь Мопра».

Гэта блазмоўна выклікала ростам сьвядомасьці і актыўнасьці працоўных мас і ўзмацненьня агітацыйна-растлумачальнай працы нізавымі ячэйкамі Мопру сярод шырокіх колаў фабрычна-заводзкіх рабочых і бядняцка-серадняцкай часткі вёскі.

Лёзунг ЦК Мопру СССР аб пераводзе ўсёй працы нізавых ячэек Мопру на ўся арганізацыя, і таму растуць з кожным днём агіткультурныя запатрабаваньні і з боку нізавога кіруючага актыву.

З гэ

На Савецкай Беларусі

Выпусьціць першую пазыку калектывізацыі

ЗАСЛАЎЛЬ (па тэлефону). Раённы сход актыву сельгасрабочых вынес пастанову—хадайнічаць перад урадам аб выпуску ПЕРШАЕ пазыкі калектывізацыі—і падпісаўся на гэтую пазыку на 1.310 рублёў.

САМАХВАЛАВІЧЫ (наш кар.). Агульны сход прафактыву пастанавіў прасіць урад выпусьціць першую пазыку калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Папярэдняя падпіска на пазыку дала каля 1.300 рублёў.

***

Дэлегаты Менскага акруговага зьезду сель.-гас. рабочых падпісаліся на першую пазыку калектывізацыі на суму звыш 10.000 рублёў.

Прыезд брыгады калгасьнікаў Клімаўшчыны

ПРАПОЙСК. (Наш кар.). Прыехала брыгада з 6-ці калгасьнікаў з Клімавіч для дапамогі калектывізацыі раёну. Брыгада прымала ўдзел у пашыраным сходзе сялян мястэчка Прапойск. У выніку сяляне мястэчка. у ліку 200 чалавек арганізавалі калгас.

Брыгада зараз выехала ў Гайчынскі, Рышкаўскі і Кульчыцкі сельсаветы для ўдзелу ў рабоце па сканчэньні суцэльнай калектывізацыі.

С.-г. арцель давае памольны збор

ЛОЕЎ. (Наш кар.). Сельска-гаспадарчая арцель у вёсцы Вострава незаконна і самавольна выдатквала хлеб, які паступаў, у якасьці памольнага збору, з млыну арцелі. Значная колькасьць хлеба хавалася на кватэры старшыні арцелі Коласава. Гомельскі акргандаль перадаў пракуратуры справу арцелі для прыцягненьня вінаватых да судовай адказнасьці.

Плян мясазагатовак за сьнежань ня выкананы

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Плян мясазагатовак за сьнежань выкананы толькі на 55 проц. Горш за ўсіх выканаў плян малочна-жывёлагадоўчы саюз (на 45 проц.). Акргандаль прапанаваў усім заготаўчым арганізацыям прыняць тэрміновыя меры да поўнага выкананьня пляну мясазагатовак.

Закрыты дзьве сынагогі

МАГІЛЕЎ (наш кар.). Гарадзкі савет задаволіў хадайніцтва рабочых броварну «Пралетары», а таксама раду школ гораду аб закрыцьці дзьвёх сынагог у прадмесьці гораду—Лупалаве. Будынкі сынагог перадаюцца школам для культурных патрэб.

Будынак царквы—пад школу

САМАХВАЛАВІЧЫ (наш кар.). Агульны сход членаў калгасу «Камвуз Беларусі», разам з беднякамі і серадняками вёсак Дудзіцкага сельсавету, абсалютнай большасьцю галасоў супроць 13 пастанавіў прасіць РВК закрыць царкву і перадаць яе будынак пад сямігодку, а маемасьць царквы—на карысьць калектывізацыі. Дудзіцкі поп падаў заяву ў сельсавет аб адмаўленьні ад сану.

Ф.

Забіты член сельсавету

ГОМЕЛЬ (наш кар.). У вёсцы Гдынь, Камарынскага раёну, у апошніх лічбах сьнежня зьверскі забіты актыўны член сельсавету т. **Раманаў**, які прымаў удзел у хлебазагатоўках і калектывізацыі. Прыняты энэргічныя меры для выяўленьня забойцаў. Агульны сход сялян патрабаваў суровага пакараньня вінаватых.

Вылазка яўрэйскага шавіністага

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Клясавы вораг знайшоў сабе агента ў асобе рабочага бабруйскага кішэчнага заводу, члена КП(б)Б **Кацнэльсона.** Кацнэльсон сеяў нацыянальную варожасьць паміж рабочымі, нацкоўваў рабочых розных нацый адзін на другога. Рабочых-расійцаў, якія прыяжджалі з другіх гарадоў, Кацнэльсон угаворваў не заставацца на заводзе, а выяжджаць з гораду. Ён вёў паход супроць дырэктара заводу, зьдзекваўся з маладога рабочага-беларуса, адмаўляўся навучаць бронь. З-за Кацнэльсона цярпела ўся работа на заводзе.

Зараз усе учынкі Кацнэльсона выкрыты. Ён выключаны з партыі і саюзу і зьняты з работы.

Бюро акругкому КП(б)Б ацаніла ўчынкі Кацнэльсона, як **вылазку клясавага ворага пад маскай яўрэйскага шавінізму.** Бюро АК адзначыла, што вылазка палячалася тым, што партыйныя арганізацыі на заводзе не вялі барацьбы з канкрэтнымі праявамі яўрэйскага шавінізму. Бюро пацьвердзіла пастанову гаркому аб выключэньні Кацнэльсона з партыі і аб перадачы справы пракуратуры.

Гняздо п'яніц і прагульшчыкаў у каўбаснай майстэрні

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). У каўбаснай майстэрні сельсаюзу на працягу доўгага часу група адсталых рабочых вяла паход супроць мерапрыемстваў па аздараўленьні выбарчасьці, па барацьбе з п'янствам і прагуламі.

Прагульшчыкі, падкулачнікі **Селязьнёў, Астроўскі, Каваленка** выступілі супроць прапановы прадстаўніка саюзу аб барацьбе з папойкамі на выторчасьці. Каваленка ўнёс прапанову галасаваць за дазвол піць гарэлку.

П'яніцы ледзь не правалілі прапановаў арганізаваць таварыства па барацьбе з п'янствам. Селязьнёў сарваў пастанову аб зборы мяшкоў на патрэбы загатоўчых арганізацый, ён-жа выступаў з абвінавачаньнем партыі ва «ўціску кулакоў, якія даюць прадукты гораду».

Рабочы Астроўскі ў п'яным выглядзе папсаваў 185 кілёграм каўбасы.

Учынкі гэтай групы выкрыты толькі зараз, бо самакрытыка ў майстэрні была вельмі слаба разгорнута. Саюз прымірэнча адносіўся да шкодных дзейнасьці групы. Каваленка дагэтуль застаецца членам групкому.

Адміністратар Розэнталь даў вымову Астроўскаму толькі пасьля энэргічных намаганьняў прафупоўнаважанага; прычым Розэнталь апраўдваўся потым тым, што «прафупаўнаважаны прымусіў яго даць вымову Астроўскаму».

Што зроблена па лістох рабселькораў

Па заметках, якія пасылаліся рэдакцыяй на расьсьледваньне: «Бюракратычныя адносіны члена партыі да справы перавыбарчай кампаніі», «Камуністы—хутаранін», «Шкодныя людзі», «Клясавыя ворагі яшчэ вучацца ў нашых навучальных установах», «Камуністы—афярысты», «Калі будзе пакладзены канец», «Воўк у авечай скуры», «Да чысткі неабходна ачысьціцца», «Да ўвагі праверачнай камісіі», «Калі будзе пакладзены канец», «Аб былых людзях». Менская АКК паведамляе, што гэтыя заметкі будуць скарыстаны ў часе чысткі партарганізацый, да якіх датычаць заметкі.

Заметкі: «Каго датычыць аздараўленьне апарату», «Спэкулянты і ліпэнцы кіруюць с.-г. каапэрацыяй», «Да прадстаячай чысткі апарату МЦРК», «Хібы ў працы у Чэрвеньскіх установах», «Богападмятайлы», «Як апралетарызаваны сын пралетарызаваў бацьку», «Ліст», Прымазаўся», «Аб Крушоўскім», «Муж і жонка Музыкіны маюць некалькі дамоў і працуюць», «Пякучыя злачынствы лясьніка Шулжыка», «Папутчык», «Каралі на Беларусі»—будуць скарыстаны, як паведамляе Мен. АКК, у часе чысткі сав. апарату таго раёну, пра які пісана.

Па заметках: «Аб раскладаньні адміністрацыі акрфа», «Вылучэньне ў Менакрфа», «Аб фінансавай падатковай камісіі», «Водгук», было зроблена расьсьледваньне і пытаньне разглядалася на прэзыдыуме АКК. пастановай якога вынесена партыйцам рад спагнаньняў і наогул прыняты рад мерапрыемстваў па аздараўленьні апарату акрфа.

Зьняты з працы па 1-й катэгорыі НК РСІ па чысткі апарату супрацоўнік ЦСУ **Барсукоў** за сьвядомае ўтойваньне свайго сацыяльнага паходжэньня і як непарваўшы сувязі з папоўскай сям'ёй, якая пазбаўлена выбарчых праў. Таксама ўзьнята пытаньне перад Гомельскай акруговай выбарчай камісіяй аб пазбаўленьні Барсукова выбарчых праў і перад ЦП саюзу саўгандальслужачых аб магчымасьці прабываньня яго ў прафсаюзе.

Ліквідаваць прарывы ў рабоце прамысловасьці

ЗАГАД СТАРШЫНІ ВСНГБ

Старшыня Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР тав. **Грысевіч** выдаў загад па БССР аб асноўных задачах прамысловасьці Беларусі ў другім годзе пяцігодкі.

— Першыя вынікі работы прамысловасьці за кастрычнік і лістапад гэтага году,—гаворыцца ў загадзе,—сьведчаць аб тым, што **тэмп разгортваньня вытворчасьці недастаткова. Валавая прадукцыя за два месяцы, у параўнаньні з адпаведным пэрыядам мінулага году, павялічылася на 50,6 проц., супроць 65 проц., прадугледжаных кантрольнымі лічбамі і 70 проц., прадугледжаных удасканаленым прамфінплянам.**

Недавыкананьне пляну адзначаецца амаль што ва ўсіх галінах прамысловасьці. Асабліва адстаюць цагляная, мэталяапрацоўчая, ільнапрадзільная, папяровая, гарбарная вытворчасьці.

Вельмі дрэнна праходзіць вывазка лесаматар'ялаў, якая на 1-га студзеня 1930 г. складала 7,2 проц. гадавога пляну па дрывах і 3,5 проц. па драўніне.

Тэмп росту прадукцыйнасьці працы ў новым апэрацыйным годзе яшчэ недастатковы. У параўнаньні з мінулымі гадамі, наглядаецца значнае зьмяншэньне прагулаў (у кастрычніку 0,59 супроць 0,86 у кастрычніку 1928 г.), але ўсё-ж зварачае на сябе ўвагу рост нявыхадаў на работу па хваробе (у кастрычніку 1929 г.—7,06 проц., супроць 6,12 проц. у верасьні). Ёсьць падстава меркаваць, што павышэньне хвароб ідзе за лік утоеных прагулаў.

Працдысцыпліна ў часе работы на радзе прадпрыемстваў далёка не на вышыні—слабая нагрузка рабочага дня, гутаркі ў часе работы перашкаджаюць узьняцьцю прадукцыйнасьці працы.

Адзначаючы рад дасягненьняў у сацыялістычным спаборніцтве, загад заваострае ўвагу гаспадарчых арганізацый на тым, што **спаборніцтва разгарнулася ўшырыню, а не ў глыбіню;** значная частка рабочых яшчэ актыўна ня ўцягнута ў сацспаборніцтва—колькасьць ударнікаў складае ўсяго 30 проц. усіх рабочых, занятых на прадпрыемстве, адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал прымае слабы ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве.

Загад адзначае, што першыя два месяцы новага году далі **нездавальняючыя вынікі ў адносінах зьніжэньня сабекошту прадукцыі.** Асабліва дрэнна стаіць справа са зьніжэньнем сабекошту ў гарбарнай прамысловасьці.

У метах ліквідацыі прарываў у рабоце прамысловасьці, загад прапануе прыняць рад тэрміновых мер:

Максымальна павялічыць тэмп разгортваньня вытворчасьці, больш паскораным тэмпам правесьці падрыхтоўку да пераводу прадпрыемстваў на бесьперапынны рабочы тыдзень, дабіцца пералому ў адносінах павышэньня прадукцыйнасьці працы і г. д.

Галявой задачай павінна стаць **барацьба прамысловасьці з стратамі.** Неабходна в усёй рашучасьцю абвясьціць вайну драпежніцкаму і нерацыянальнаму скарыстаньню рабсілы, сырцу, матар'ялаў, апалу, абсталяваньня, нядбайным адносінам да машын і варштатаў.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на разгортваньне рацыяналізацыі вытворчасьці, прыцягнуўшы да гэтай справы шырокія масы рабочых.

У загадзе адзначана, што рад трэстаў і гаспадарчых адзінак **слаба падрыхтаваны да новага будаўніцтва,** да гэтага часу адсутнічаюць праекты па многіх аб'ектах будаўніцтва. Трэба мабілізаваць увесь апарат, каб дабіцца паскарэньня тэмпаў капітальнага будаўніцтва, абавязковага выкананьня тэрмінаў пуску як новых прадпрыемстваў, так і новага абсталяваньня.

Да гэтага часу амаль што адсутнічаў **кантроль за якасьцю прадукцыі.** Далейшае паляпшэньне якасьці прадукцыі павінна стаяць у цэнтры ўвагі ўсёй прамысловасьці. **Неабходна ажыцьцявіць пастанову аб прыцягненьні да адказнасьці асоб, вінаватых у пагоршаньні якасьці прадукцыі.**

У заключэньне ў загадзе падкрэсьліваецца, што тыя вялікія задачы, якія стаяць перад прамысловасьцю, могуць быць з посьпехам выкананы толькі пры **шырокім разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва, як сталага мэтаду масавай барацьбы рабочай клясы за паскарэньне тэмпаў індустрыялізацыі.** Неадкладная задача дня—большае ўцягненьне ў сацыялістычнае спаборніцтва рабочых, адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу, максымальная дапамога арганізацыі ўдарных брыгад.

Усе кіраўнікі трэстаў і прадпрыемстваў павінны штомесячна ставіць на агульных сходах рабочых даклады аб выкананьні прамфінплянаў, усебакова абгаворваць на сходах мерапрыемствы, накіраваныя да выкананьня дырэктыў аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі.

3-я больніца не здавальняе запатрабаваньняў хворых

Няма належнага кіраўніцтва больніцай

У Менскую страхкасу даволі часта паступаюць скаргі на дрэннае абслугоўваньне хворых у 3-й больніцы. Ёсьць выпадкі, калі маткі ня хочуць туды аддаваць сваіх дзяцей.

Гэтыя скаргі маюць пад сабой пэўную падставу. Сапраўды, харчаваньне хворых у 3-й больніцы горшае, чым у іншых, адносіны мэдыцынскага пэрсаналу патрабуюць паляпшэньня, не ўстаноўлены правілы, ці павінны знаходзіцца маткі пры дзецях, а калі павінны, дык да якога ўзросту; штат больніцы невыстарчальны, маткі сьпяць з дзецьмі ў адным ложку, адміністрацыйны нагляд культае на абедзьве нагі.

У апошнія месяцы, калі ў горадзе пашырылася эпідэмія шкарлятыны, ложкі ў 3-й больніцы былі запоўнены звыш нормы. Пастанова аб высяленьні з памяшканьня больніцы вэнэрычнай і тыфознай клінікі ня выконваецца, ня гледзячы на тое, што гэта высяленьне дало-б магчымасьць павялічыць лік ложкаў для хворых.

Ці можна лічыць нармальным зьявішчам, калі дзеці, хворыя на шкарлятыну, якія павінны знаходзіцца ў больніцы 6 тыдняў, забіраюцца бацькамі пасьля 3-тыднёвага прабываньня?

Дзе тут адміністрацыйна-мэдыцынскае кіраўніцтва?

Акруговы аддзел аховы здароўя павінен сур'ёзна заняцца паляпшэньнем работы ў 3-й больніцы. Трэба дабіцца, каб бацькі былі зацікаўлены ў ізаляцыі дзяцей, каб яны ня ўнікалі пасылкі дзяцей у 3-ю больніцу. Акруговы аддзел аховы здароўя павінен выпрацаваць цьвёрдыя інструкцыі, пры якіх умовах дазваляецца маткам быць сумесна з хворымі дзецьмі.

Адначасова трэба пакланаціцца, каб маткі, якія знаходзяцца ў больніцы, разам з хворымі дзецьмі, мелі-б асобныя ложкі. Трэба таксама паленьшыць харчаваньне хворых.

Самае галоўнае--палепшыць адміністрацыйнае кіраўніцтва больніцы.

Н—т.

Эпідэмічныя захворваньні па БССР

Захворваньні на **сыпны тыфус** за апошні час значна зьменшыліся.

Нязначнае павялічэньне ў першай палове сьнежня заўважана толькі ў дзьвёх округах: на Аршаншчыне—20 новых захворваньняў, на Магілеўшчыне—24. У іншых округах захворваньня на сыпны тыфус адзінічныя.

Значныя захворваньні дае **шкарлятына** як у гарадох, так і ў вёсках, асабліва на Меншчыне і Магілеўшчыне. Так, за першую палову сьнежня ў Віцебшчыне зарэгістравана 150 новых захворваньняў на шкарлятыну, у Магілеўшчыне—157, Гомельшчыне—140, Меншчыне—250.

У округах цяпер шырока праводзіцца кампанія прафілактычных прышчэпак, узмоцнена забесьпячэньне лекавых устаноў сывараткамі.

Менск

Выплата выйгрышаў чырвонаармейцам

Камісія Дзяржбанку выплаціла выйгрышы па 2-й пазыцы чырвонаармейцам № артпалку. 12 чырвонаармейцаў выйгралі звыш 750 рублёў, з іх 3 чал. выйгралі па 200 руб.

Некалькі выйгрышаў палі на аблігацыі чырвонаармейцаў Казлова, Коласа і Бабіцкага, але яны не атрымалі грошай, бо прадалі свае аблігацыі.

САНІТАРНЫ НАГЛЯД ЗА ДАМАМІ І ПРАДПРЫЕМСТВАМІ

Члены сэкцыі аховы здароўя Менгарсавету, для правядзеньня санітарнага нагляду за прадпрыемствамі і дамамі, прымацоўваюцца да пэўных вучасткаў гораду, па месцы іх жыхарства.

ДЭЛЕГАЦЫЯ БЕЛАРУСКІХ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ ВЫЕХАЛА Ў СМАЛЕНСК

У Смаленск выехала дэлегацыя беларускіх фізкультурнікаў у ліку 25 чалавек, для заключэньня сяцлагавору паміж фізкультурнікамі Беларусі і Заходняй вобласьці.

ДА ЗАБОЙСТВА ТАВ. ВІШНЯКОВА

Працаўнікі міліцыі і крымвышуку БССР, а таксама курсанты школы міліцыі паслалі спачуваньне начальніку Віцебскай міліцыі з поваду сьмерці на баявым пасту інспэктара крымвышуку т. Вішнякова, забітага бандытамі.

ІЛЬГОТЫ ВУЧНЯМ ПАДРЫХТОЎЧЫХ КУРСАЎ

Прэзыдыум ВСНГБ прапанаваў трэстам і прадпрыемствам скараціць работы дзень рабочым, якія займаюцца на курсах па падрыхтоўцы у ВТНУ да 6 гадзін. Ільготныя гадзіны аплачваюцца за кошт прадпрыемстваў.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ Ў ФАБЗАВУЧЫ

Прэзыдыум ВСНГБ устанавіў парадак дадатковага прыёму 700 чалавек у школы фабзавучу. З ліку прынятых у фабзавучы ня менш 90 проц. павінны быць дзеці рабочых і выхаванцы дзіцячых дамоў. Агульна-асьветная падрыхтоўка ў разьмеры курсу 7-мігодкі абавязкова для тых, хто прымаецца ў фабзавучы мэталістых і дрэваапрацоўшчыкаў, для іншых—5-цігодка. Набор павінен быць скончаны на працягу студзеня 1930 г.

Школы фабзавучу будуць укамплектаваны выключна праз біржы працы.

Здарэньні

Зьверскі ўчынак. У прыбіральні дому № 20 па Камуністычнай вуліцы знойдзена яшчэ жывым дзіця ўзросту 8-мі дзён. Крымвышукам устаноўлена, што дзіця ўкінула ў прыбіральню яго матка, працаўніца Белдзэнржбіно **Б. Штэйн.** Злачынка затрымана і прыцягваецца да адказнасьці.

Спалілі лісты. Гэтымі днямі, калі паштальён вымаў лісты з паштовай скрынкі № 10 па Чэрвенскім тракце, ён заўважыў, што лісты былі абліты газай і падпалены. Сярод абгарэлых лістоў аказаліся лісты гр-ну Н. М. Шчарбо, гор. Смаленск і Н. І. Сьвірскай гор. Барысаў і іншых. Крымвышук просіць аўтараў лістоў зьявіцца ў першую групу.

СУД

Справа доктара Пэскіна

Вярхоўны суд разглядаў касацыйную скаргу доктара Пэскіна Б. на прыгавар Менскага акруговага суду, якім ён быў прыгавораны да аднаго году зьняволеньня з забаронай на працягу двух год займацца мэдычнай практыкай. Вярхоўны суд канстатаваў, што Пэскін праявіў бюракратызм ня як доктар, а як адміністратар, што памылковая дыягностыка, калі ад яе ня было цяжкіх вынікаў, ня можа разглядацца, як крымінальнае злачынства, што ступень сацыяльнай небясьпечнасьці Пэскіна не патрабуе яго абавязковай ізаляцыі, Вярхоўны суд знайшоў магчымым бязумоўнае зьняволеньне замяніць Пэскіну на ўмоўнае з выпрабавальным тэрмінам на працягу трох год, забараніўшы яму на працягу двух год займаць адміністрацыйныя пасады.

Што перадае Менская радыё-станцыя

Панядзелак, 6-га студзеня

17-00—Сялянская радыё-газэта (з польск. адда.).
18-00—Рабоча-Сялянскі Унівэрсытэт па радыё.
19-00—Беларуская радыё-газэта (з літ. адда.).
20-00—Праверка часу.
20-00—Час калектывістага.
20-30—Гутарка на нац. мове.
21-00—Канцэрт па заказе радыё-слухачоў.
23-00—Вывучэньне нямецкай мовы.

Аўторак, 7-га студзеня

17-00—Час піянэра і школьніка.
17-30—Палітычныя перадачы.
18-00—Рабоча-Сялянскі Унівэрсытэт па радыё.
19-00—Беларуская радыё-газэта (з яўр. адда.).
20-00—Праверка часу.
20-00—Радыёаматар па радыё.
20-30—Сялянская вячорка.
21-30—Канцэрт опэрнай музыкі.

Серада, 8-га студзеня

17-00—Сялянская радыё-газэта (з яўрэйск. адда.).
18-00—Рабоча-Сялянскі Унівэрсытэт па радыё.
19-00—Беларуская радыё-газэта (з польск. адда.).
20-00—Праверка часу.
20-00—Беларускі Батрак.
20-30—Камсамольская перадача.
21-00—Навуковая лекцыя: тэхніка масам.
21-30—Гістарычны канцэрт, прысьвечаны творч. Бэтховэна.
23-00—Вывучэньне нямецкай мовы.

Клюб навуковых працаўнікоў
СЁНЬНЯ, 6 студзеня—ДАКЛАД праф. ВАЛЬФСОНА:
„Навука, рэлігія, барацьба клясаў"
Пасьля дакладу—канцэрт.
Пачатак а 8 гадз. 30 м. увеч.

Вышаў з друку, дасылаецца падпісчыкам і паступае ў продаж № 10—12 часопісі

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ".

ЗЬМЕСТ:

Я. Васілевіч.—Аб некаторых пытаньнях сацыялістычнага будаўніцтва і барацьбы за генэральную лінію партыі.
А. Сталевіч.—Аб вытоках беларускага нацыянал-дэмакратызму і нацыянал-фашызму.
Т. Прокопчык.—Калгаснае будаўніцтва ў БССР.
К. Бэнэн.—Клясавая барацьба на хлебанарыхтоўчым фронце.
М. З.—Ход чысткі радоў КП(б)Б.
І. Цыунчык.—Аб гэарытычнай перападрыхтоўцы парт. актыву.
Н. Клебанаў, Д. Фішбэйн.—Вурокі чысткі невытворчых ячэек.
А. Некрашэвіч.—Беларускі нацыянал-фашызм і яго сабрат—беларускі нацыянал-дэмакратызм.

Матар'ялы і дакументы.

Пастанова III пленуму ЦК КПЗБ.
Прывітаньні III пленуму ЦК КПЗБ.
Заява III пленуму ЦК КПЗБ.

Крытыка і бібліяграфія.

Да канфэрэнцыі аграрнікаў-марксыстых.

Аб адной палітычна-шкоднай кнізе—**П. Бранаевец, Г. Бондар, М. Вашчыла-Вірын.**

Супроць беларускай кандрацеўшчыны—**С. Маргелаў.**
Аб падручніках на эканом. палітыцы—**П. Медзьведзкі.**

НАМ ПІШУЦЬ

У канторы „УМС" панае заціск самакрытыкі і сямейнасьць

У 1925 годзе арганізавалася беларуская кантора «Уралмэта», якая потым рэарганізавалася ў Заходнюю кантору «УМС». На чале канторы быў пастаўлены «спэц» А. Ю. Бэйлінсон, які пачаў арганізоўваць апарат канторы з сваякоў. Першым быў прыняты швагер Бэйлінсона Яхнін, за Яхніным на пасаду старшага бухгальтара прызначаецца Фішкін. Фішкін бярэ да сябе ў памочнікі свайго старога знаёмага Шапіра. Шапіра «рэкамэндуе на пасаду ст. рахункавода жонку свайго знаёмага Якабсонка Далей са Скурсынды-кату пераводзіцца машыністка Хан. Упоўнаважаным па Гомельскай акрузе прызначаецца сваяк Бэйлінсона Сорын.

Калі Бэйлінсон быў у камандыроўцы, яго былы намесьнік В'южанін (член партыі) прымае на работу па пуцёўцы АК т. Цамулёва.

Бэйлінсон не падарпеў «чужака» і, карыстаючыся часам, калі В'южанін быў у камандыроўцы, зволіў Цамулёва. Каб змазаць звальненьне Цамулёва, Бэйлінсон адначасова звальняе прынятага па пратэкцыі Поляка, але праз некаторы час прымае яго зноў у кантору.

Прыехаўшы В'южанін суняраўчы супроць звальненьня Цамулёва. За гэта Бэйлінсон пачынае В'южаніна ігнараваць, адхіваць ад кіраваньня канторай прыцягваючы шваграа Яхніна, які фактычна робіцца намесьнікам Бэйлінсона.

Праз некаторы час быў зволены з работы Сіткевіч (партыец), які меў адзін «недахоп». Пра ўсе хваравітыя зьявішчы, якія рабіліся ў канторы, ён пісаў заявы ў РСІ.

Бэйлінсон часта арганізоўвае пірушкі ў сябе дома і ў канторы. Яхнін часта атрымлівае камандыроўкі, набаўкі пэнсіі, абодва яны доўгі час карыстаюцца канторскай мэбляй і г. д. Бэйлінсон выганяе з свайго габінэту беларускі гурток і кажа: «тут габінэт, а ня месца для якога-небудзь беларускага гуртка».

Праз некаторы час кіраўніком канторы прызначаецца тав. Ташлык, а Бэйлінсон прызначаецца яго намесьнікам. Ён, карыстаючыся адсутнасьцю Ташлыка, па імянным патрабаваньні праз біржу працы прымае на работу Шміленіч, якая высоўваецца на вышэйшую пасаду, усё гэта чамусьці робіцца ў адсутнасьці загадчыка канторы. Муж Шміленіч—былы лесапрамысловец і спэкулянт і цяпер варочае нейкімі справамі ў Маскве.

Шапіра і Якубсон пасылалі прыбіраль пчыцу купляць ім сьненьнік і калі купленае ім не спадабалася, дык ёй было прапанавана купіць што-небудзь іншае за ўласныя грошы.

Накіраванаму Нарваенкаматам дэмабілізаванаму камандзіру Старобіну не даюць магчымасьці знаёміцца з працай. Даручылі тэхнічную, простую работу.

Месяц таму назад у кантору быў прыняты на пасаду загадчыка сэкцыяй мэталявырабаў т. Загрэцкі, спэцыялісты. Яхнін застаўся нездаволеным гэтым. Вакол Загрэцкага стварацца ўмовы, пры якіх немагчыма працаваць. Замест існуючага прайскуранту яму падсоўваецца прайс-курант, які існаваў тры гады таму назад. Машыністка чапляецца да кожнага слова. Яхніна трэба доўга прасіць, каб ён даў якую-небудзь даведку.

Вучня—камсамольца т. Каца ня ўводзяць у курс справы і нічога яму не растлумачваюць. Мабыць, баяцца «канкурэнцыі».

Мы пытаемся, калі разгоняць піхую сямейку ў «УМС»? Калі «УМС» стане савецкай установай ня назвай, а на справе?

Нябэйлінсонаўцы.

Такім ня месца ў БДУ

На другім курсе літаратурна-лінгвістычнага аддзяленьня пэдфаку ВДУ вучыцца студэнт **Скрыган,** Янка Аляксеевіч, пахаджэньне якога яўна кулацкае. Бацькі яго, якія жывуць на хутары Гарохаўка, Слуцкага раёну, аж да 1925-26 году мелі каля 80 дзес. зямлі, каля 20 кароў і коняй, наймалі шмат батракоў, жорстка іх эксплёатавалі і г. д.

Пасьля абрэзак, іх гаспадарка з поўнамешчыцкай ператварылася ў кулацкую.

Скрыган Янка, паводле вестак з месц, трымае з бацькамі матар'яльную сувязь, а ў БДУ атрымлівае дзяржаўную стыпэндыю і лічыцца пралетарскім студэнтам.

Такім элемэнтам не павінна быць месца ў БДУ.

С. В.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Клюб імя Карла Маркса. А 10 гадзіне раніцы нарада - канфэрэнцыя мабілізаваных для работы ў калгасах камуністак.

У памяшканьні Кастрычніцкага райкому МОПР'у — пасяджэньне жаночай сэкцыі райкому МОПР'у.

У памяшканьні клюбу Эльводу, а 4 гадзіне дня пачынаецца чыстка ячэйкі КП(б)Б Эльводу.

У 30 школе (Рэвалюцыйная, 28), а 7 гадзіне—адкрыты сход цэхавай ячэйкі сацвыхаў пры ячэйцы працасьветы. Запрашаюцца ўсе настаўнікі гор. Менску.

Клюб савецкіх і гандлёвых служачых. А 7 гадз. увечары ў памяшканьні чытальні сход чытачоў бібліятэкі клюбу. Будзе заслуханы даклад аб рабоце бібліятэкі і інфармацыя камісіі па агляданьне работы бібліятэкі.

ЗАЎТРА

Дом камуністычнай асьветы. А 7 гадзіне ўвечары ў пакоі № 19 адбудзецца групавая кансультацыя т. **Саевіча** на тэму «Як правесьці Ленінскія дні ў клюбах, Ленінскіх куткох на прадпрыемствах і ва ўстановах.

Клюб працасьветы. А 7 гадзіне ўвечары склікаецца другая група раённага дэлегацкага сходу жанаддзелу Фрунзаўскага РК КП(б)Б.

Клюб акрвыканкому. А 6 гадзіне ўвечары куставы сход ячэйкі прыгараднага сельсавету Фрунзаўскага райкому КП(б)Б з удзелам камуністых трох саўгасскіх ячэек, Дасьледчага інстытуту імя Леніна, Хлебазаводу, заводу «Чырвоны Тэкстыльшчык», заводу Гандальбуду, Мустэхнікуму і Паліттэхнікуму. У парадку дня даклад аб рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, аб задачах камуністых, якія працуюць на вёсцы, і задачах шэфскіх арганізацый.

Клюб савецкіх і гандлёвых служачых. А 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу нарада старшынь мясцкомаў і членаў бюро сэкцыі саюзу савецкіх і гандлёвых служачых.

З 29-XII—29 г. пачалася **чыстка тэхнічнага апарату саюзу Працасьветы.** Чыстку павінны прайсьці тэхпрацаўнікі ЦП саюзу Працасьветы, дому асьветы, бібліятэкі пры доме і тэхпрацаўнікі групкомаў і мясцкомаў, для якіх тэхнічная работа ў прафгранах зьяўляецца асноўнай працай. Камісія па чыстцы просіць ўсе матар'ялы даваць старшыні камісіі т. **Булко** (пляц Волі, Дом працы, 3-ці паверх, пакой № 13) ці т. **Глаз** (з 17 школы).

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР
Э. ТОЛЬЛЕР
Серада, 8 студзеня, для саюзу працасьветы
ГОП-ЛЯ, ЖЫВЁМ
Білеты ў саюзе і ў групкомах Пачатак роўна а 8 гадз. 30 м.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР —()— Панядзелак, 6 студзеня
спэктаклі Бел. Дзярж. Вандр. тэатру
„ПЛЫТАГОНЫ"
Бытавая камэдыя ў 5 актах ГАЛУБКА.
Народныя сьпевы, скокі і музыка.
Білеты ў касе тэатру. Пачатак—а 8 з пал. гадз.

Аўторак 7 студзеня **„ПІНСКАЯ МАДОННА"**
Сатыра-шарж у 3-х актах з пралёгам і эпілёгам ГАЛУКА
Білеты ў касе тэатру. Пачатак а 8 гадз. 30 м.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"
3 панядз., 6 студзеня
НОВЫ САВЕЦКІ ФІЛЬМ.
Вытворчасьці САВКІНО
КАЛІ ЗАЦЬВІТУЦЬ ПАЛІ
Па матар'ялах Г. Зелянцова
—у 6 частках—
У галоўных ролях: А. Ольгіна, В. Марыніч, А. Антонаў і інш.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
Песьня пра мэталь
Кіно-абразок паводле вершу А. Жарова
(——) ПАЧАТАК СЭАНСАЎ (——)
1-га—7 г., 2-га—8 г. 30 м., 3-га—10 г.
Каса—ад 5 гадз. 30 мін. ўвечары.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
— З панядзелка, 6 студзеня. —
ВЯЛІКІ ПОСЬПЕХ!)—(ВЯЛІКІ ПОСЬПЕХ!
3-ці ТЫДЗЕНЬ ПАСТАНОЎКІ
З ПРЫЧЫНЫ НАДЗВЫЧАЙНАГА ПОСЬПЕХУ, З МЭТАЙ ДАЦЬ МАГЧЫМАСЬЦЬ УСІМ ПАГЛЯДЗЕЦЬ —) НАШУМЕЎШУЮ КАРЦІНУ (—
САЛАЎКІ
(Салавецкія лягеры асаблівага прызначэньня)
—) у 7-мі частках (—
Пранятнута пастаноўка на 3-ці тыдзень.
Звыш праграмы—часопісь «САВКІНО» № 9. —(Пачат. а 1-г сэансу а 7 гадз. ув. Каса ад 5 гадз. увеч.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА" З ПАНЯДЗЕЛКА, 6 СТУДЗЕНЯ, гістарычны фільм з пралёгам
ДОМ НА ВУЛЬКАНЕ
Сюжэт—А. ФОЛЯНА. Сцэнары—БЭК-НАЗАРАВА.
Мастак—А. ГАНЧАРСКІ. Рэжысэр—А. МАСІ.
ГАЛОЎНЫЯ РОЛІ ВЫКОНВАЮЦЬ:
Алеўнік Кать—Д. КІРІЯНІ. Кітальні'к Петрас—ГРАЧЫНЯ. Чорнарабочы Ахмэд—А. АЛЕКНЕРАЎ
Нафтапрамысловца—тав. АЙЗАЗЯН. Старшы прыгаляты—М. КАРАКАШ. Каваль Уладзімер—А. ШЫРАЙ.
Фільм прысьвечаны бакінскаму пралетарыяту і яго гэраічнай барацьбе ў часе рэакцыі 1907-8 г.
Звыш праграмы кіно-фільм з „Комсомольской Правды"
„ТАЯМНІЧАЯ ЭПІДЭМІЯ"
Пачатак роўна а 7 гадзіне.——Каса—ад 5 гадзін.

1-ы дзіцячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІНЭР"
(Будынак кіно «ПРАЛЕТАРЫ»)
Сёньня і штодзенна
амэрыканскі фільм **НАНУК**
Штодзенна 3 сэансы.
ПАЧАТАК 1-га сэансу а 2 гадзіне дня, 2-га—3 гадз. 30 м., 3-га—5 гадз.
Каса адкрыта ад 12 гадз. дня.

Ад Бабруйскага Аддзяленьня Дзяржбанку
З 1-га студзеня 1930 году ў м. Гарадзец, Рагачоўскага раёну, пры арганізуючымся Агрэіндустрыяльным камбінаце імя «Правды»
ПАЧАЛА ФУНКЦЫЯНАВАЦЬ
Каса Бабруйскага Аддзяленьня Дзяржаўнага Банку СССР
Каса выконвае наступныя апэрацыі:
1. Прыём і выдача грошай па бягучых рахунках.
2. Пераводныя апэрацыі.
3. Камісійныя апэрацыі.
4. Усе апэрацыі з дзяржпазыкамі:
Пакупка і продаж аблігац